СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 6.51, 16.56, 10.05;
Віцебск — 6.44, 16.44, 10.00;
Магілёў — 6.40, 16.46, 10.06;
Гомель — 6.36, 16.44, 10.08;
Гродна — 7.08, 17.10, 10.02;
Брэст — 7.03, 17.16, 10.13.

МЕСЯЦ:
Апошняя квадра
19 кастрычніка

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

23 КАСТРЫЧНІКА 1992 г.
пятніца, № 214 (21992).

РОЗГАЛАС

З БЕСПРАЦОЎЕМ МОЖНА ЗМАГАЦЦА

ПОЛАЦК. Нягледзячы на цяжкае эканамічнае становішча, у полацкім вытворчым аб'яднанні «Шкловалакно» рабочых звальняць не збіраюцца. Наадварот, робяць усё магчымае, каб захаваць рабочыя месцы. У бліжэйшыя два месяцы вырашана часова спыніць прыём на работу, на шрагу вытворчасцей скараціць асартымент прадукцыі і працоўны тыдзень. Ажыццяўляецца таксама перавод работнікаў у тыя цэхі і карпусы, якія працавалі з недагрузкай. Шукаюцца і іншыя шляхі. Адзіныя, каму рэальна пагражае беспрацоўе,—гэта парушальнікі працоўнай дысцыпліны.

Есць магчымасць зарабіць 20 тысяч

Ліхаманка на каляровы метал дакацілася і да Слонімшчыны. Штукары знаходзяць розныя шляхі і крыніцы, каб здабыць даволі ходкі цяпер тавар.

Здараецца і такое: перапранаецца «брыгада» ў рабочую вопратку і на спецмашыне з камуфляжам сувязістаў накіроўваецца на «работу». Сярод белага дня пад выглядам рамонтных работ яны крадуць сотні метраў кабелю і дроту з каляровага металу.

А аднойчы выйшаў са строю экскаватар на драбільна - сартавальным заводзе—з машыны знік сілавы кабель. Дырэктар прадпрыемства паабяцаў мясцоваму ўчасткоўму 20 тысяч рублёў, калі той знойдзе злодзея і, відома, кабель.

Віктар ВАЛАДАШЧУК.

«РУКА» БЕЛАРУСІ Ў САНКТ-ПЕЦЯРБУРГУ

Прынцыпова новую мадэль колавага трактара рыхтуе да вытворчасці Кіраўскі завод Санкт-Пецярбурга. Трактары К-20, якія ў хуткім часе пачнуць сыходзіць з канвеера, вельмі манеўраныя, зручныя ў эксплуатацыі, універсальныя. З адпаведным наборам прычапной тэхнікі яны здольныя выконваць практычна любую сельскагаспадарчую работу. Таму і атрымалі назву «Арандатар». Можа не варта было б паведамляць пра гэта, каб не адзін факт. У стварэнні новага трактара ёсць і беларуская доля, бо вельмі важныя часткі пастаўляе Гродзенскі завод карданных валаў.

ДА КАНЦА ПАДПІСНОЙ КАМПАНІІ ЗАСТАЛОСЯ 8 ДЗЁН

Падпіска на рэспубліканскія газеты і часопісы ўступіла ў заключную стадыю, і мы прапануем вам даныя, якія адлюстроўваюць тыражы некаторых выданняў Беларусі па стану на 15 кастрычніка 1992 года.

«Звязда» — 92.209 экземпляраў;
«Народная газета» — 219.025 экземпляраў;
«Советская Белоруссия» — 247.376 экземпляраў;
«Белорусская ніва» — 46.833 экземпляры;
«7 дней» — 69.883 экземпляры;
«Знамя юности» — 35.405 экземпляраў;
«Рэспубліка» — 13.418 экземпляраў;
«Чырвоная змена» — 2.383 экземпляры.

А вось як размяркоўваецца папярэдні тыраж «Звязды» па розных рэгіёнах рэспублікі.

Брэсцкая вобласць — 8.391 экземпляр;
Віцебская вобласць — 15.599 экземпляраў;
Гомельская вобласць — 18.814 экземпляраў;
Мінская вобласць — 24.633 экземпляры;
Магілёўская вобласць — 9.330 экземпляраў;
Гродзенская вобласць — 12.886 экземпляраў;
Горад Мінск — 2.556 экземпляраў.

Абедзве таблицы не патрабуюць асаблівых каментарыяў. Зазначым толькі, што «Звязда» ўжо пераўзышла тыраж бягучага года.

Кар. «Звязды».

Выпуск «Розгаласа» падрыхтавалі: У. Здановіч, І. Карней, С. Сулкоўскі.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб парадку дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Уключыць у парадак дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання наступныя пытанні:

1. Аб праекце Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб размеры мінімальнай заработнай платы».

2. Аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

3. Інфармацыя Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб становішчы ў эканоміцы і мерах па яе стабілізацыі.

4. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Дзяржаўным бюджэце Рэспублікі Беларусь на 1992 год».

5. Аб праекце Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Рэспублікі Беларусь.

6. Аб рэспубліканскім рэферэндуме.

7. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб індэксацыі даходаў насельніцтва з улікам інфляцыі».

8. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь».

9. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» (другое чытанне).

10. Аб праекце Палажэння аб ацэнцы жылля з улікам спажывецкіх якасцей.

11. Аб невыкананні Урадам рэспублікі Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 29 кастрычніка 1991 года «Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» са змяненнямі, унесенымі Пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 23 красавіка 1992 года.

12. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь».

13. Аб праекце Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні Палажэння аб Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь».

14. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб службе ў дзяржаўным апараце» (другое чытанне).

15. Аб ваеннай дактрыне Рэспублікі Беларусь.

16. Аб парадку праходжання ваеннай службы афіцэрамі-грамадзянамі Рэспублікі Беларусь за межамі Рэспублікі Беларусь.

17. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб усеагульным воінскім абавязку і вайсковай службе» (другое чытанне).

18. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абароне» (другое чытанне).

19. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь» (другое чытанне).

20. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб статусе ваеннаслужачых» (другое чытанне).

21. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб праве ўласнасці на зямлю» (другое чытанне).

22. Справаздача Старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь аб дзейнасці Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

23. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Камітэце дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь».

24. Справаздача выконваючага абавязкі Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Кандрацьева У. К. аб барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй.

25. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб узмацненні барацьбы са злачынствамі ў сферы эканомікі і з карупцыяй» і аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь».

26. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пагранічных войсках Рэспублікі Беларусь» (другое чытанне).

27. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь» (другое чытанне).

28. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб альтэрнатыўнай (працоўнай) службе».

29. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсіённым забеспячэнні ваеннаслужачых, асоб кіруючага і радавога складу органаў унутраных спраў».

30. Аб праекце Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб ваеннай прысязе на вернасць народу і Рэспубліцы Беларусь».

31. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унутраных войсках Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь».

32. Аб індэксацыі ўкладаў насельніцтва Рэспублікі Беларусь у ашчадных банках рэспублікі.

33. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю (Асноўны Закон) Рэспублікі Беларусь».

34. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб страхаванні».

35. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях».

36. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь» (другое чытанне).

37. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь».

38. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб калектыўных дагаворах і пагадненнях» (другое чытанне).

39. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс законаў аб працы Рэспублікі Беларусь».

40. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб парадку вырашэння калектыўных працоўных спрэчак (канфліктаў)».

41. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці».

42. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Пракуратуры Рэспублікі Беларусь».

43. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аператыўна-вышуковай дзейнасці» (другое чытанне).

44. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове здароўя грамадзян Рэспублікі Беларусь».

45. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб санітарна-эпідэмічным дабрабыце насельніцтва».

46. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб медыцынскім страхаванні грамадзян і фінансаванні аховы здароўя».

47. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб фізічнай культуры і спорце».

48. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове і зберажэнні гісторыка - культурнай спадчыны» (другое чытанне).

49. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах дзяржаўнай навукова - тэхнічнай палітыкі» (другое чытанне).

50. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб патэнтах на вынаходствы».

51. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб патэнтах на прамысловыя ўзоры».

52. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб таварных знаках і знаках абслугоўвання».

53. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь».

54. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб банках і банкаўскай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь».

55. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб бюджэтным ладзе і бюджэтным працэсе».

56. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб валютным рэгуляванні».

(Заканчэнне на 3-й стар.).

В. КЕБІЧ:

Мы павінны аб'яднаць намаганні ў імя галоўнага...

ІНФАРМАЦЫЯ ЎРАДА «АБ СТАНОВІШЧЫ Ў ЭКАНОМІЦЫ І МЕРАХ ПА ЯЕ СТАБІЛІЗАЦЫІ» ВЯРХОЎНАМУ САВЕТУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Паважаны Старшыня!
Паважаныя народныя дэпутаты!

Сапраўды існуе вялікая неабходнасць у тым, каб і парламент, і народ больш поўна ведалі, які цяперашні стан нашай эканомікі, як урад ацэньвае гэты стан і якія крокі ён робіць.

У той або іншай меры вы валодаеце абстаноўкай. Таму я бачу сваю задачу не ў тым, каб закрануць літаральна ўсе пытанні, колькасць якіх — вялікае мноства, а ў тым, каб выдзеліць галоўныя праблемы, даць аб'ектыўны аналіз таму, што адбываецца, якія тэндэнцыі, як можа пайсці далейшае развіццё падзей.

Перш за ўсё зусім відавочна: эканоміка наша перажывае вельмі складаны для яе час. Бясспрэчна, яна нясе на сабе адбітак тых працэсаў, якія ў цэлым звязаны з пераходам да зусім новай грамадска-дзяржаўнай будовы. І гэта, бадай, галоўнае. Такія буйныя пераўтварэнні ніколі і нідзе не праходзілі гладка і бязбольна. Гэта аб'ектыўны працэс, і спрачацца яго, зводзіць да пытанняў тыпу «Хто вінаваты?», адназначна спрабаваць усё расставіць па палічках, — занятак безнадзейны. Больш важна, на наш погляд, іншае — улавіць правільна агульную сітуацыю і вызначыць, якія механізмы павінны быць уключаны ў дзеянне, каб выйсці з таго цяжкага становішча, у якім мы апынуліся.

Прычын нашых сённяшніх цяжкасцей нямала. Але цяпер больш за ўсё наслойваюцца тыя з іх, якія звязаны з рэзкім абмежаваннем магчымасцей набыцця ва ўмовах шматразовага павышэння цэн такіх жыццёва важных рэсурсаў, як нафта, збожжа і цэлы рад іншых. А гэта ў сваю чаргу робіць уплыў на цану канчатковай прадукцыі і пачало ўжо ствараць немалыя цяжкасці з яе збытам.

Менавіта гэта вызначае тая акалічнасць, што спад прамысловай вытворчасці, які ў нас сёння ёсць (а ён склаў за 9 месяцаў каля 14 працэнтаў), менш за ўсё з'яўляецца праяўленнем нейкага ўнутранага стану нашай эканомікі. Гэта хутчэй яе рэакцыя на знешнія фактары, на імкненне структурна прыстасавацца да новых умоў.

Калі для аналізу выключыць з агульных аб'ёмаў прамысловай вытворчасці нафтаперапрацоўку, шынную прамысловасць, вытворчасці, падвергнутыя канверсіі, то яцяжка ўбачыць, што агульнае зніжэнне вытворчасці па астатніх галінах знаходзіцца ў межах 6—8 працэнтаў, ды і то ў значнай меры яно звязана (асабліва ў машынабудаванні) з пераходам на новую наменклатуру вырабаў, якая карыстаецца попытам. Некалькі большае зніжэнне вытворчасці ў аграрным сектары. Яно складае прыкладна 17 працэнтаў. Тут таксама перш за ўсё робяць уплыў прычыны структурна-цэнавага характару і забяспечанасці рэсурсамі. Натуральна, што становішча ў базавых галінах адбілася на тым, што на 15 працэнтаў знізіўся нацыянальны даход, а гэта ў сваю чаргу ўскладніла фінансавае становішча дзяржавы, абмежавала магчымасці інвестыцый і выканання сацыяльных праграм.

Тым не менш наша эканоміка, калі яе ацэньваць на макраўзроўні, з'яўляецца даволі ўстойлівай, яна сёння вытрымлівае такія прапорцыі паміж атрыманым і выкарыстаным нацыянальным даходам, якія даюць магчымасць ёй функцыяніраваць у адносна прымальных для цяперашніх умоў рэжымах. Ва ўсякім разе расходы на накапленне і спажыванне ў дзеючых цэнах не перавышаюць аб'ём крыніц, што ўтвараюцца для гэтых мэт.

За 9 месяцаў атрыманы нацыянальны даход склаў 411 мільярдаў рублёў, выкарыстаны — 387 мільярдаў рублёў, або 94 працэнты.

Інакш кажучы, наша эканоміка сябе не праядае і здольная выйсці з цяперашняга цяжкага стану. І нам трэба працаваць над тым, каб стварыць для гэтага неабходныя ўмовы. Відома, зрабіць гэта не проста, таму што пастаянна, амаль ці не кожны дзень, узнікаюць усё новыя і новыя праблемы, на якія трэба неадкладна рэагаваць.

Прычым праблемы часцей за ўсё параджаюцца не столькі ўнутранымі прычынамі, колькі тым, што адбываецца ў эканоміках іншых краін СНД. З гэтымі ж краінамі (і гэта не адзін раз падкрэслівалася) у нас разгорнутыя, гадамі існуючыя эканамічныя адносіны і адразу, як вы разумееце, яны змяніцца не могуць.

Гэта вядомыя ісціны, але не лічыцца з гэтым нельга. Таму мы і дабіваемся, каб адносіны ў рамках Садружнасці былі як мага больш упарадкаванымі. Тым не менш, нягледзячы на ўсе цяжкасці, станаўленне рынкавай эканомікі ідзе. Вызвалена пераважная большасць цэн, а гэта важнейшы, пускавы механізм рынку. Вядома, ва ўмовах таварнага дэфіцыту свабодная цана становіцца вельмі магутным фактарам націску як на вытворцу, так і на спажыўца. І мы гэта ўжо адчулі. Але тут нічога не зробіш. У рыначнай эканоміцы свае, часам вельмі строгія, нават жорсткія, законы. Вартасці свабоднага цэнаўтварэння могуць праявіцца, і яны, несумненна, праявяцца, калі сфарміруюцца і пачнуць працаваць усе рыначныя структуры і абудзецца напаўненне таварнай масай.

Гэта па-першае. А па-другое, і гэта таксама важнейшы элемент рынку, на прынцыпова новай аснове, дыяметральна процілеглай дырэктыўнай, сталі наладжвацца гаспадарчыя сувязі. У прадпрыемстваў з'явілася магчымасць свабоднага, без указанняў зверху, выбару партнёраў на аснове ўзаемных эканамічных інтарэсаў. І гаспадарнікі такія формы адносін сталі асвойваць і пачынаюць прывыкаць дзейнічаць самастойка.

Фарміруюцца і іншыя элементы рынку. Пры падтрымцы ўрада ідзе станаўленне прадпрымальніцкіх, банкаўскіх і камерцыйных структур. Хоць і марудна, але ўсё ж праводзіцца прыватызацыя. Але цяпер такі этап, калі дзяржава многія важныя нервы эканомікі павінна трымаць у сваіх руках з тым, каб працэсы, якія адбываюцца, не пераходзілі тую мяжу, калі негатыўныя з'явы становяцца незваротнымі, а дзяржава страчвае магчымасць аказання насельніцтву належнай сацыяльнай падтрымкі. І ўрад, нягледзячы на крытыку некаторых вельмі ўжо амбіцыйных радыкалаў, праводзіць і далей будзе праводзіць лінію на тое, каб дзейнічаць узважана, асцярожна, рабіць усё для таго, каб аблегчыць людзям тую ношу, якая выпала на іх долю.

Так, большасці насельніцтва жывецца цяпер нялёгка. Але няма ў нас ні голаду, ні масавага беспрацоўя. І людзі не будуць мерзнуць зімой у сваіх кватэрах. Урад робіць і ў далейшым будзе рабіць усё, што ад яго залежыць, для таго, каб максімальна змякчыць нашаму народу вынікі эканамічных цяжкасцей. Я пра гэта не раз ужо гаварыў і пацвярджаю гэта сёння.

Такая агульная сітуацыя. Цяпер — аб асобных вузлавых праблемах. Тут на першы план я, безумоўна, выставіў бы пытанні бюджэтнай палітыкі. Галоўнае ў ёй заключаецца ў тым, каб, з аднаго боку, — актыўна ўздзейнічаць на структурную перабудову эканомікі, стварэнне рыначнага асяроддзя і ўмоў, пры якіх прадпрыемствы былі б зацікаўлены ў эфектыўным вядзенні гаспадаркі, а з другога — забяспечыць фінансаванне неабходных расходаў і падтрымку жыццёвага ўзроўню насельніцтва.

(Працяг на 2-й стар.).

ДА КАНЦА ПАДПІСКІ ЗАСТАЛОСЯ 8 ДЗЁН. ІНДЭКС «ЗВЯЗДЫ» — 63850, ПАДПІСНАЯ ЦАНА НА ПАЎГОДА — 120 РУБЛЁЎ.

ВАША ЗДАРОЎЕ

Масаж кісці

Наўрад ці знойдзецца чалавек, які ніколі не зведаў стрэсу — стану, які ўзнікае пры ўздзеянні на арганізм надзвычайных або паталагічных раздражняльнікаў. Выйсці з яго бывае часам настолькі складана, што даводзіцца звяртацца да ўрача.

Асабліва часта абрушвае на людзей стрэс сучасны скарацечны і напружаны час. Але, відаць, нешта такое зведвалі ў экстрэмальных сітуацыях і нашы далёкія продкі. Інакш не растлумачыш, чаму старажытныя вучоныя, у тым ліку вучоныя Усходу, шукалі сродкі, пры дапамозе якіх чалавек сам дапамагаў бы сабе супакоіцца, зняць неспрыяльныя вынікі псіхаэмацыянальнага стрэсу.

Адзін з такіх спосабаў — прыйшоўшае да нас з індыйскіх, кітайскіх, карэйскіх лячэбна-аздараўленчых сістэм уздзеянне на рэфлексагенныя зоны на кісцях рук. Не ўсе ведаюць, што па насычанасці акупунктурнымі зонамі, на якія пра-

цыруюцца ўсе органы чалавека, кісці не ўступаюць вуху і ступні.

Першы спосаб. Возьміце грэцкі арэх і паміж далонямі, рабіце кругавыя рухі. Сціскайце арэх спачатку з невялікім намаганнем, а затым паступова павялічваючы яго (фота 1). Масіруючы

далоневую паверхню, больш уздзейнічайце на болевыя ўчасткі далоні. Час: 1—3 хвіліны.

Можна рабіць масаж і двума арэхамі (фота 2).

Пакладзіце на далонь два аднолькавыя па размеру арэхі. Затым павольна рабіце кругавыя рухі, перакатваючы адзін арэх праз другі або паварочваючы іх па плоскасці далоні адзін за адным: у правай далоні — па гадзіннікавай стрэлцы, у левай — супраць. Час: 3 — 5 хвілін. Калі няма арэхаў, можна выкарыстаць шарыкі для настольнага тэніса.

Другі спосаб. Возьміце шасцігранны аловак. Заціснуўшы яго паміж далонямі, расцірайце іх, перакатваючы аловак, паступова павялічваючы намаганне да з'яўлення ў далонях прыемнага цяпла. Час: 1—2 хвіліны.

Пасля гэтага кісцю правай рукі расцірайце алоўкам тыльную паверхню левай кісці да з'яўлення ў ёй адчування цяпла (фота 3). Час: 1—2 хвіліны. Затым тое самае левай рукой.

Можна, узяўшы аловак у правую руку, расціраць ім унутраны бакі кожнага пальца левай рукі. Тое самае другой. Час: 2—3 хвіліны.

Узяўшы аловак правай рукой, націскайце яго незавостраным канцом на болевыя кропкі (калі яны ў вас ёсць) левай кісці, робячы кругавыя рухі на працягу 1—2 хвілін (фота 4). Тое самае левай рукой. Паспрабуйце рабіць няпоўныя рухі спачатку ў адзін, затым у другі бок на працягу 30 — 40 секунд, націскаючы на вобласць кожнай болевай кропкі.

Закончыўшы масаж кісцяў, разатрыце правай рукой кожны палец левай рукі (а затым наадварот) рухамі спачатку ўздоўж пальца, потым упоперак. Час: 2—3 хвіліны на кожную.

Паклапоцімся пра свае вочы

Кожны ведае народную прымаўку: «Беражы, як зрэнку вока». А вось ці ўмеем мы берагчы, даглядаць свае вочы, як даглядаем рукі, твар? Майце на ўвазе, гэта патрэбна і каб лепш бачыць, і каб лепш выглядаць. Нічога ж так не ўпрыгожвае твар, як ясныя, выразныя вочы з чыстымі павекамі і дагледжанымі вейкамі.

● Калі вы працавалі на вуліцы ў мароз, дождж, у запыленым асяроддзі, прамыйце вечарам вочы растворам борнай кіслаты (палавіну чайнай лыжкі на шклянку вады), рамонкам, кропам або чайным настоем, каб павекі не пачырванелі.

● Не перанапружвайце вочы: калі доўга чытаеце, вяжаце і г. д., дайце ім адпачынак. Заплюшчыце на 5—10 хвілін, пакладзіце на павекі халодную прымочку з любога рэкамендаванага вышэй раствору. Карысная таксама гімнастыка для вачэй: наглядзіце ўверх—уніз —направа—налева, зрабіце кругавыя рухі вачамі, спачатку ў адным напрамку, потым у другім.

● Шчотачку для тушы, якой падводзіце вейкі, трэба перыядычна мыць у мыльным растворы і добра прапаласкаць. Наносіцца туш у напрамку да краю вейкаў, асцярожна, каб яна не трапіла на слізістую абалонку. На ноч туш здыміце ватным тампонам з вадкім крэмам, «малачком» або цёплым алеем.

● Калі вейкі тонкія або рэдкія, лепш не карыстацца тушшу часта, бо яны становяцца ломкімі, слабымі. «Падсілкоўваць» вейкі можна любым алеем — сланечнікавым, касторавым, персікавым...

● Калі лёгка ўзнікаюць раздражненні, перастаньце карыстацца тушшу, зрабіце ахалоджваючыя прымочкі з борнай кіслатой, краі павекаў змажце тонкім слоем гідракарцізонавай вочнай мазі.

СМАЧНА ЕСЦІ!

Кансерваваныя супы

Да страў у слоіках раней гаспадыні адносіліся, скажам прама, не вельмі ўважліва. І дарэмна. Цяпер жа, калі «супы», «баршчы» ў магазінах пакуль што ёсць (і каштуюць нямнога па цяперашніх цэнах), раім павярнуцца да іх тварам, тым больш, што з гэтых «паўфабрыкатаў» можна згатаваць добрыя стравы.

ПА-ПЕРШАЕ, НЕКАЛЬКІ АГУЛЬНЫХ ПАРАД

● Слоікі трэба адкрываць непасрэдна перад прыгатаваннем. Адкрытымі кансервы можна захоўваць не больш 12—15 гадзін, а ў халадзільніку — 2—3 сутак.

● Каб пазбегнуць страты вітамінаў, змесціва слоіка трэба выкладваць у кіпень.

● Награванне патрэбна выключна для таго, каб змяшаць састаўныя часткі стравы. Працяглае гатаванне — зніжэнне смакавых якасцей.

● Разбаўленне кансерваў робіцца ў наступных суадносінах: 1:1 (роўныя колькасці вады і кансерваў) для кансерваў з мясам і зялёнай капусты; 1:1,5 для такіх, як «Боршч са свежай капусты», «Боршч з квашанай капусты», «Бурачнік» і інш.; 1:0,5 — для пюрэпадобных супоў.

А ЦЯПЕР РЭЦЭПТЫ

Расольнік па-хатняму. 1 слоік кансерваў, 1,5 л булёну ці вады, 150 г капусты, 4 бульбіны, смятана.

У кіпячы булён ці ваду пакласці парэзаную свежую капусту, давесці да кіпення, дадаць нарэзаную бульбу і варыць да паўгатоўнасці бульбы. Потым пакласці кансервы і варыць на малым полымі да гатоўнасці бульбы. Смятана — пры падачы на стол.

Боршч: 1 слоік кансерваў, 2 л булёну ці вады, 150 г капусты, 4 бульбіны, смятана, зяленіва.

У кіпячы булён ці ваду пакласці нашынкаваную свежую ці квашаную капусту, давесці да кіпення, дадаць бульбу і кансервы. Варыць да гатоўнасці.

Гэтак жа можна прыгатаваць бурачнік. Смятана, зяленіва — пры падачы на стол.

Боршч з кансерваў «Капуста тушаная»: 1 слоік кансерваў, 1,5 л булёну ці вады, 1—2 бульбіны, смятана, зяленіва, соль.

У кіпячы булён ці ваду пакласці нарэзаную кубікамі бульбу і варыць 10 хвілін, пасля чаго дадаць кансервы і варыць на невялікім агні да гатоўнасці агародніны. Запраўка па смаку соллю, смятанай, зяленівам.

Мы павінны аб'яднаць намаганні ў імя галоўнага...

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

Менавіта такі падыход, такія прынцыпы нагі рэалізуюцца, хоць і з немалымі складанасцямі. І справа тут не ў тым, што вельмі ўжо вялікая падатковая нагрузка, як гэта некаторыя спрабуюць паказаць. Агульныя паступленні ў даход бюджэту за мінулы перыяд года к атрыманаму нацыянальнаму даходу склалі 37 працэнтаў супраць 41 працэнта за такі ж перыяд мінулага года.

Пытанне не ў гэтым. Недабор даходаў бюджэту ўзнік галоўным чынам з-за зніжэння аб'ёмаў вытворчасці і ў яшчэ большай меры з-за несвоечасовага паступлення сродкаў за прадукцыю, адгружаемую ў іншыя рэгіёны. У асобныя перыяды, асабліва ў першым паўгоддзі, запазычанасць прадпрыемстваў перад бюджэтам дасягала 5—6 мільярдаў рублёў, ці прыкладна палавіны месячных паступленняў. Можна сабе ўявіць, наколькі такая праўха ўскладняла бягучае фінансаванне.

Урад і Нацыянальны банк вымушаны былі з другога паўгоддзя пайсці на тое, каб у чарговасці разлікаў на першае месца паставіць выкананне абавязацельстваў перад дзяржаўным бюджэтам. Гэта дало магчымасць у адносна кароткі час не толькі скараціць запазычанасць бюджэту, але і прымусіла гаспадарнікаў больш асцярожна распараджацца фінансамі.

Гэтай жа мэце паслужыла правядзенне шырокамаштабнага залічэння ўзаемных плацяжоў, а таксама такая вельмі буйная акцыя, як папаўненне прадпрыемстваў абаротнымі сродкамі за кошт ільготных доўгатэрміновых крэдытаў банка. Усё гэта абышлося ў мільярды рублёў крэдыту, але гэта мера была крайне неабходная.

Хоць трэба сказаць і іншае. Некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў нядобрасумленна аднесліся да гэтай аперацыі, спрабуючы атрымаць танныя крэдыты пры наяўнасці ўласных сродкаў. Нацыянальнаму банку прыйшлося навесці тут парадак, і мы яго ў гэтым падтрымліваем.

Вялікія недапаступленні ў бюджэт звязаны і з такой адносна новай для нас з'явай. Практычна любая праверка прадпрыемстваў і камерцыйных структур падатковай службай выяўляе ўтойванне даходаў і вялікія неплаціжы. Толькі за мінулы перыяд года па выніках праверак было забрана ў бюджэт з улікам штрафаў каля 1,5 мільярда рублёў. Але ў нас ёсць падставы меркаваць, што ўтойваюцца значна большыя сумы. Трэба, вядома, сказаць, што і падатковаму заканадаўству яшчэ далёка да дасканаласці. Сітуацыя мяняецца, набываецца вопыт і становіцца відавочнай неабходнасць унясення ў гэта заканадаўства асобных змяненняў і ўдакладненняў. І я вельмі рады, што такое пытанне ўнесена ў парадак дня сесіі. Цяпер мы прапануем знізіць стаўку падатку на дабаўлены кошт з 28 да 25 працэнтаў.

Унесены на ваш разгляд прапановы і па раду іншых змяненняў як у сістэме падатковага заканадаўства, так і ў сістэме акцызаў.

Становішча ў эканоміцы, якое складваецца ў гэтым годзе, асабліва ў сувязі з хуткай дынамікай павышэння цэн, неаднаразова прыводзіла да неабходнасці бюджэтных удакладненняў і паправак. Такое развіццё падзей прадугледжвалася. Таму Вярхоўны Савет, зацвярджаючы Закон аб дзяржаўным бюджэце рэспублікі на 1992 год, прадаставіў ураду права ўносіць удакладненні ў зацверджаны бюджэт, калі адхіленні як па даходах, так і па расходах акажуцца вельмі істотнымі. І ўжо ў маі з улікам рэзкага павышэння цэн урад быў вымушаны гэта зрабіць. У выніку аб'ём бюджэту практычна падвоіўся, але пры гэтым былі захаваны асноўныя прапорцыі і прыярытэты, якія першапачаткова ў яго закладваліся. Гэта дало магчымасць на той момант рэальна вызначыць размеры даходаў і прафінансаваць прадугледжаныя мерапрыемствы. Але да верасня стала відавочным, што фактычнае развіццё падзей намнога апярэджвае зробленыя папраўкі. Запатрабавалася яшчэ раз вярнуцца да гэтага пытання.

Праведзены сур'ёзны і старанны аналіз мінулага перыяду і зроблены магчымыя ацэнкі да канца года. Стала відаць, што на гэты раз вытрымаць зададзеныя бюджэтныя прапорцыі, і перш за ўсё гранічны ўзровень яго дэфіцыту, не ўдасца. Рост даходаў бюджэту не зможа забяспечыць фінансавымі рэсурсамі ўзрастаючыя расходы, якія звязаны не толькі з павышэннем цэн, але і паяўленнем прынцыпова новых патрэбнасцей у дзяржаўных сродках.

Гэта перш за ўсё расходы, звязаныя з рэалізацыяй рашэнняў Вярхоўнага Савета па падтрымаанню парытэту цэн у сельскай гаспадарцы, павелічэнням мінімальнай заработнай платы, а з 1 верасня — заработнай платы настаўнікам, урачам, работнікам культуры і мастацтва. Сюды ж адносіцца неабходнасць абслугоўвання ўнутранага доўгу рэспублікі, большая частка якога — запазычанасць дзяржавы перад насельніцтвам па ўкладах ва ўстановах ашчаднага банка. Вялікія дадатковыя бюджэтныя асігнаванні запатрабаваліся на выкананне Чарнобыльскай праграмы, дзе мы аказаліся зусім адзінокімі, і фінансаванне арміі. Усё гэта ацэньваецца ў 100 мільярдаў рублёў і выклікае неабходнасць пры максімальна напружаным плане паступлення даходаў пайсці на павелічэнне бюджэтнага дэфіцыту ў сувязі з прадаўжэннем росту цэн.

Можна сабе ўявіць, які ўплыў зробіць на нашу фінансавую сістэму і спажывецкі рынак тая акалічнасць, калі мы і ў далейшым будзем максімальна жорстка абмяжоўваць дзяржаўныя расходы, у той час калі ў іншых дзяржавах СНД ужо даўно бюджэтны дэфіцыт перавышае ўсе дапушчальныя размеры. Таму з усіх пунктаў гледжання будзе правамерным, калі Вярхоўны Савет прыме прапануемыя папраўкі да Закона аб бюджэце на 1992 год, установіць размер дэфіцыту ў межах 12—15 працэнтаў да аб'ёму расходаў.

Да гэтага можна дадаць, што такі дэфіцыт узгоднены з Міжнародным валютным фондам, эксперты якога нядаўна дэталёва вывучалі эканамічнае становішча нашай рэспублікі. Што датычыць бюджэту, то я абмежаўся б сказаным, паколькі адпаведныя матэрыялы ў вас ёсць і больш падрабязна пра гэта скажа ў сваім дакладзе міністр фінансаў С. Янчук.

Велізарнае значэнне для стабілізацыі фінансавага і ў цэлым эканамічнага становішча рэспублікі маюць нашы ўзаемаадносіны з краінамі СНД. Адносна невялікі, але вельмі складаны перыяд, які мінуў з моманту ўзнікнення гэтай садружнасці, пераканаўча паказаў, што спробы адгарадзіцца адна ад адной нічога іншага, акрамя ўрону нацыянальным эканомікам, не прыносяць.

І я думаю, што сёння кіраўнікі большасці краін гэта ўсвядомілі. Мы патрэбны, нават больш—крайне неабходны адзін аднаму. На гэта яшчэ раз вывела сустрэча ў Бішкеку. Нягледзячы на пэўную палярнасць у поглядах на структуру садружнасці, пераважным усё ж было імкненне знайсці такія формы арганізацыі, якія рэалізоўвалі б задачу супрацоўніцтва. Я лічу, што гэта мае выключна важнае значэнне. Зразумела, відаць, ні сёння, ні заўтра нам не ўдасца прымаць пагадненні, якія б задавальнялі ўсе краіны СНД. Але жыццё пераконвае, што трэба ісці на гібкія формы адносін, заключаючы пагадненні як на шматбаковай, так і (калі гэта ў інтарэсах справы) на двухбаковай аснове. Урэшце не выключана, што гэтыя пагадненні могуць стаць ядром для вырашэння тых праблем, якія маюць выключна важнае значэнне для ўсіх краін СНД і рэспублік былога Саюза. Удзельнічаючы ў сустрэчы ў Бішкеку, мы, бясспрэчна, кіраваліся перш за ўсё інтарэсамі рэспублікі. Таму, рэальна ацэньваючы абстаноўку, палічылі магчымым (ва ўсякім разе ў даны момант) застацца ў рублёвай зоне, каб не падвергнуць рызыцы не толькі нашу эканоміку, але і магчымасць падтрымліваць на больш ці менш прымальным у цяперашніх умовах узроўні жыццё людзей.

Да чаго прыводзяць непрадуманыя крокі ў гэтым напрамку, мы з вамі бачым на прыкладзе Прыбалтыкі. Таму я скажу проста: мы ўважліва сочым за абстаноўкай, і ў нас ёсць гатоўнасць дзейнічаць так, як гэтага запатрабуюць акалічнасці. Разважны сэнс і фактычнае становішча спраў пераконваюць у тым, што без цеснага супрацоўніцтва, без узаемнай падтрымкі, калі хочаце, не толькі мы, але і іншыя краіны СНД не змогуць выбрацца з таго становішча, у якім аказаліся сёння. І палітычных амбіцый тут зусім не павінна быць. Нам трэба вучыцца беражліва будаваць свае ўзаемаадносіны з усімі дзяржавамі СНД, і асабліва з Расіяй, паколькі ў нас з ёй найбольш аб'ёмныя, самыя разгорнутыя эканамічныя і іншыя сувязі.

Псаваць адносіны з Расіяй было б не проста пакуль неабдумана, а згубна як з эканамічнага, так і з палітычнага пунктаў гледжання. І наогул, без нармальных дружалюбных сувязей з нашым усходнім суседам нерэальна і немагчыма пабудаваць незалежную беларускую дзяржаву. А ў нас, на жаль, ёсць сілы, якія спрабуюць выкарыстаць найменшую магчымасць, каб хоць шпілечным уколам, але ўсё ж зачапіць суседа, не думаючы аб тым, якімі не толькі палітычнымі, але перш за ўсё эканамічнымі вынікамі гэта паварочваецца.

Тым больш, што Расія ўсё-такі ўзяла частку знешняга доўгу былога Саюза, якая прыпадае на рэспубліку, ідзе нам насустрач у іншых пытаннях. У прыватнасці, нягледзячы на тое, што для ўсіх краін СНД Расія вызначыла парадак, пры якім пастаўкі нафты будуць ажыццяўляцца па цэнах, што значна перавышаюць іх узровень для расійскіх спажыўцоў, ёсць дагаворанасць аб тым, што хоць бы да канца гэтага года нам будзе пастаўляцца нафта па ўнутрырасійскіх цэнах. Праўда, вялікія праблемы ў гэтым плане ўзнікаюць непасрэдна з нафтаздабываючымі прадпрыемствамі, якія запрошваюць значна больш высокія цэны.

Аднак, як бы справа з цэнамі ні складвалася, мы абавязкова павінны закупіць тую нафту, якая нам неабходна, інакш паставім пад удар рэспубліку.

Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што павелічэнне цэн на нафту, як на базавы від паліва, дасць штуршок падаражанню іншых энергарэсурсаў. Нам трэба глыбока ўсвядоміць, што час таннага паліва, на якое арыентаваны ўсе нашы тэхналогіі, уся гаспадарчая дзейнасць, незваротна мінуў. Сёння ўдзельныя расходы паліва ў нас па меншай меры ў два разы вышэйшыя, чым у развітых краінах. Вытрымаць далей такую энерганагрузку наша эканоміка не ў стане.

І мы абавязаны, мяняючы структуру народнай гаспадаркі, улічваць гэту акалічнасць, забяспечыць максімальнае зніжэнне энергаспажывання і ў вытворчасці, і ў быце. Урад заняты гэтай праблемай. Мы маем намер таксама самым сур'ёзным чынам мадэрнізаваць сваю нафтаздабываючую і нафтаперапрацоўчую галіну за кошт укаранення сучасных заходніх тэхналогій, уключаючы паглыбленую перапрацоўку нафты. Ужо ў гэтым годзе значна расшыраны аб'ём геолагаразведачных работ з тым, каб нарасціць уласную нафтаздабычу. Вядзецца распрацоўка комплекснай энергазберагаючай праграмы. І, вядома, трэба адыходзіць ад таго, каб быць прывязаным толькі да Расіі па пастаўках нафты. Крокі да таго, каб расшырыць круг партнёраў па пастаўках нафты, прымаюцца. Ужо працяглы час вядзецца работа, каб атрымліваць яе з краін Блізкага Усходу, Нігерыі. Але гэта перспектыва. А сёння рэальнасць такая, што, акрамя нашага суседа, іншых пастаўшчыкоў проста няма. І з гэтым трэба лічыцца.

У гэтым плане выключна важнае значэнне набываюць для рэспублікі пытанні знешнеэканамічнай палітыкі. І ўрад актыўна праводзіць адпаведную работу. Яна ідзе па раду напрамкаў. Важнейшыя з іх — прыцягненне замежных крэдытаў. Да гэтага часу агульная сума адкрытых нам крэдытных ліній складае каля 1,5 мільярда долараў. З улікам дагаворанасцей з зарубежнымі фірмамі па канкрэтных праектах ужо ў будучым годзе ў эканоміку рэспублікі можа быць укладзена крэдытаў сама меней у аб'ёме 900 мільёнаў долараў, прычым асноўная частка сродкаў будзе выкарыстана ў якасці інвестыцый на развіццё прыярытэтных галін эканомікі (перапрацоўка сельгаспрадукцыі, нафтахімія, ахова здароўя).

Нядаўна ў ходзе майго візіту ў Аўстрыю была дасягнута згода на прадастаўленне нам урадавага крэдыту ў сумме 500 мільёнаў долараў на вельмі выгаднай аснове. Такога вялікага крэдыту ды яшчэ на такіх выгадных умовах ніводнай з рэспублік СНД заходнія краіны не прадастаўлялі.

Яшчэ адзін надзвычай важны напрамак — гэта гандаль з зарубежнымі краінамі, павелічэнне паставак нашай прадукцыі на экспарт. Тут ёсць свае складанасці. Яны не толькі ў тым, што ў нас пакуль што недастаткова хутка нарошчваецца экспартны патэнцыял, але і ў тым, што той нашай прадукцыі, якая карыстаецца попытам за рубяжом, сёння не хапае для ўнутранага рынку. І трэба шукаць тут дапушчальны баланс.

У нас у гэтым годзе значна павялічыліся экспартныя пастаўкі калійных угнаенняў, матацыклаў, радыёпрыёмных устройстваў, гадзіннікаў і некаторых іншых вырабаў, хоць у цэлым аб'ём экспарту скараціўся. Але сальда знешняга гандлю з'яўляецца дадатным і складае звыш 250 мільёнаў долараў.

Асаблівая цяжкасць у знешнім гандлі заключаецца ў тым, што ў нас яшчэ належным чынам не ўпарадкаваны пытанні бартэрных здзелак, а яны сёння дасягаюць 67 працэнтаў у агульным аб'ёме паставак на экспарт. Часта бартэрныя здзелкі, якія ажыццяўляюць асобныя прадпрыемствы, у цэлым для рэспублікі маюць неэфектыўны характар. Акрамя таго, яны істотна зніжаюць базу паступленняў у дзяржаўны валютны фонд. Таму ўрад пастаянна шукае шляхі ўдасканалення механізма ўплыву на знешнеэканамічныя працэсы, каб, з аднаго боку, максімальна абараніць інтарэсы дзяржавы, а з другога — падтрымліваць экспартна-імпартныя інтарэсы саміх вытворцаў.

Тым больш, што знешнеэканамічная дзейнасць дапаможа нам у вырашэнні праблемы рэсурснага забеспячэння прадпрыемстваў. Бо перш за ўсё недахват рэсурсаў і сучаснага абсталявання, а таксама жан'юнктура цэн і рынку, якая змянілася, ставіць у зусім новыя ўмовы работу прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі. Тым больш, што прамысловасць у нас у рамках былога Саюза ў многім фарміравалася на вываз прадукцыі і адпаведна была зарыентавана на завоз сыравіны з іншых рэгіёнаў. Цяпер многае тут ламаецца. Узяць тую ж нафтаперапрацоўку. Яе магутнасці даюць магчымасць перапрацоўваць звыш 40 мільёнаў тон нафты ў год, хоць для забеспячэння ўласных патрэб у нафтапрадуктах нам будзе дастаткова крыху больш за палавіну гэтага аб'ёму. Цяперашняя сітуацыя з пастаўкай нафты прывяла да таго, што выпуск гатовай прадукцыі на нашых нафтазаводах знізіўся на 40 працэнтаў. Пры гэтым, калі нават уласнае спажыванне нафтапрадуктаў пад удар не ставіцца, то ўсё роўна застаецца праблема з загрузкай наяўных магутнасцей і забеспячэннем нармальнай работы заводаў. Які магчымы выхад са становішча? Па першае, прыцягненне давальніцкай сыравіны на ўзаемавыгадных умовах. І гэта ўжо робіцца. Больш як 3 мільёны тон такой нафты перапрацавана ўжо. Па-другое, вядуцца перагаворы аб стварэнні беларускіх канцэсій па здабычы нафты ў Заходнесібірскім нафтагазавым комплексе. Мы разлічваем, што ўжо ў будучым годзе зможам мець першыя вынікі, улічваючы, што нашы нафтавікі, геолагі і будаўнікі даўно працуюць у гэтым рэгіёне.

Не меншую заклапочанасць выклікае ў нас такі буйнейшы шматгаліновы комплекс, якім з'яўляецца машынабудаванне. Створаны тут тэхнічны і кадравы патэнцыял не толькі дае магчымасць вырашаць найскладанейшыя праблемы аснашэння нашай эканомікі, але і можа актыўна садзейнічаць станаўленню беларускага экспарту. Аднак сёння, калі крута мяняецца попыт з боку спрадвечных спажыўцоў яго прадукцыі, калі ідзе працэс рэзкага звужэння патрэбнасці ў прадукцыі ваенна-прамысловага прызначэння і ажыццяўляецца пераарыентацыя ўсёй прамысловасці на патрэбы насельніцтва, тут, вядома, узніклі праблемы велізарнай складанасці.

Трэба ў сціслым тэрміны згарнуць выпуск тых вырабаў, попыт на якія рэзка зніжаецца, і замяніць іх новымі, якіх не хапае і ў якіх сёння і заўтра будзе гарантаваны збыт. Увогуле заўсёды павінна ісці пастаяннае абнаўленне вытворчасці. Гэта галоўная прыкмета нармальнага развіцця эканомікі, а ва ўмовах рынку без гэтага проста не выжыць. Адпаведныя распрацоўкі ўрада наконт гэтага ўжо рэалізуюцца. Яны ахопліваюць большасць прадпрыемстваў базавых галін прамысловасці, а трэць з іх ужо атрымлівае першыя практычныя вынікі.

З усёй вастрынёй стаіць гэта праблема ў сельгасмашынабудаванні, і такая работа тут пачалася ўжо. Перапрафілююцца, скажам, у адпаведнасці з рашэннем урада Магілёўскі завод сельгасмашын. Замест машын для ўнясення ўгнаенняў тут пачата вытворчасць будаўніча-дарожнай тэхнікі—кранаў на аўтамабільным ходу, асфальтаўкладчыкаў і франтальных пагрузчыкаў. Выпуск новай тэхнікі з улікам рынку асвойваюць Мінскі трактарны завод і Лідсельмаш. Такім чынам, тут, хоць і не без цяжкасцей, ідзе адаптацыя да новых умоў гаспадарання.

На жаль, гэтага нельга сказаць у адносінах да рада іншых прадпрыемстваў, і асабліва такога буйнога аб'яднання, як «Гомсельмаш». Тут велізарныя цяжкасці і з вытворчасцю, і са збытам прадукцыі. На 41 працэнт знізіўся за 9 месяцаў выпуск кормаўборачных камбайнаў. Запазычанасць пастаўшчыкам цяпер перавысіла 1 мільярд 700 мільёнаў рублёў, а банкам за атрыманыя крэдыты — 3 мільярды 200 мільёнаў рублёў. Даўгі ў сем разоў перавышаюць увесь балансавы кошт асноўных фондаў аб'яднання. Гэта ўжо мяжа банкрутства. Немалая доля адказнасці за тое, у якім становішчы аказаўся 30-тысячны калектыў Гомсельмаша, прыпадае на яго кіраўніцтва. Цяпер Дзяржкампром сумесна з мясцовымі органамі дэталёва разбіраецца з гэтым аб'яднаннем, але ўжо відавочна, што тут прыйдзецца прымаць кардынальныя меры.

Не лепшыя часы перажывае станкабудаванне. Але гэта цяжкасці аб'ектыўнага характару. Вытворчасць металарэзных станкоў зніжаецца, аднак у асноўным тых мадэляў, попыт на якія знізіўся. Актыўна ажыццяўляецца пераход на выпуск спецыяльных станкоў, у тым ліку дрэваапрацоўчых, а таксама ідзе асваенне вытворчасці тэхнічна складанай бытавой тэхнікі. Можна разлічваць, што тут праз 3—4 месяцы становішча выправіцца і спад вытворчасці спыніцца. З вялікім напружаннем пераадольваюцца цяпер цяжкасці, што ўзніклі ў аўтамабільнай, электратэхнічнай прамысловасці, вытворчасці падшыпнікаў і на іншых прадпрыемствах машынабудавання. Але тут таксама ёсць рэальныя магчымасці выйсці з цяжкага становішча, у якое яны трапілі.

Асобна — па канверсіі. Цяпер тут такое становішча. Тыя планы, што мы намецілі па пераводу абаронпай вытворчасці на грамадзянскую прадукцыю, у цэлым выконваюцца. Вядома, на тое, каб поўнасцю правесці канверсію, патрабуюцца пэўны час і немалыя затраты. У гэтым годзе фінансавая дапамога канверсуемым прадпрыемствам склала каля 500 мільёнаў рублёў. Прыйшлося пайсці і на тое, каб спісаць з іх даўгі па раней выдадзеных ім пад гарантыю былых саюзных міністэрстваў доўгатэрміновых крэдытах у межах трох мільярдаў рублёў.

У мяне ў апошні час быў цэлы рад сустрэч з дырэктарамі прадпрыемстваў і прадпрымальнікамі. І я яшчэ раз пераканаўся, што большасць з іх ведае, што і як рабіць з тым, каб не толькі спыніць спад, але і актыўна весці работу па развіццю вытворчасці, а мы са свайго боку будзем ім усяк дапамагаць у гэтым, перш за ўсё эканамічнымі метадамі. Гэта яшчэ раз, у прыватнасці, пераконвае ў тым, што ўрад павінен мець магчымасць гібкага выкарыстання нашай падатковай сістэмы для таго, каб можна было дыферэнцыраваць узровень падаткаабкладання з улікам канкрэтных акалічнасцей і фінансавага становішча асобных прадпрыемстваў. Я ўпэўнены, што гэта вельмі можа дапамагчы справе.

Гэта тое, што датычыць прамысловасці. Але не ў меншай меры агульны стан рэспублікі вызначае аграрны сектар. Ацэнка становішча ў гэтым сектары па-буйному складваецца з двух частак. Перш за ўсё, наколькі будзе гарантавана ў нас да канца года і ў бліжэйшай будучыні забеспячэнне насельніцтва прадуктамі харчавання. А па-другое — якое самаадчуванне саміх вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі.

Адказваючы на першае пытанне, трэба сказаць, што нягледзячы на тое, што ў нас адбываецца спад у сельскай гаспадарцы, асабліва цяжкасцей з-за адсутнасці ў продажы асноўных прадуктаў харчавання не зведвае насельніцтва рэспублікі, і ўрад робіць усё для таго, каб не дапусціць сур'ёзных збояў у забеспячэнні прадуктамі харчавання. Ёсць рэальная магчымасць забяспечыць сярэднедушавое спажыванне мяса і мясапрадуктаў у разліку на год на ўзроўні 67 кілаграмаў, малака — 395 кілаграмаў, бульбы — 175 кілаграмаў, гэта значыць па гэтых прадуктах не павінна быць вялікіх адхіленняў ад узроўню мінулага года. Але ёсць складанасці па цукру і алею. Што датычыць цукру. У гэтым годзе ўраджай буракоў значна ніжэйшы за мінулагодні. Адпаведна і цукру будзе атрымана менш прынамсі на 40 тысяч тон. З улікам заключаных кантрактаў на завоз цукру ў рэспубліку, а ён паступае з велізарнымі ўскладненнямі, рэальна, што мы будзем мець у гэтым годзе цукру ў межах 380 — 400 тысяч тон. Гэта амаль на 20 працэнтаў менш, чым у мінулым годзе. Але цяпер актыўна вядзецца работа па закупцы цукру на будучы год з тым, каб з улікам уласнай вытворчасці не знізіць продаж насельніцтву з дзяржаўных крыніц. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, мінімальныя патрэбы ў цукры будуць задаволены. Спажыванне яго на душу насельніцтва, паводле нашых ацэнак, складзе 36—38 кілаграмаў. Гэта ніжэй, чым раней спажывалася, але ў межах тых норм. Праўда, у межах тых норм, якія разлічваліся з нармальнага спажывання іншых прадуктаў харчавання.

Па алею. У асноўным ён у нас завазны, галоўным чынам з Украіны. Паступленне яго таксама ідзе з вялікімі перабоямі. Аднак продаж яго ў цэлым па гэтаму году складзе ўзровень мінулага года. Мы разлічваем паправіць становішча з алеем за кошт паставак па імпарту, у тым ліку і за крэдыты, якія на гэтыя мэты выдзяляе нам камісія Еўрапейскага Супольніцтва.

Усіх, вядома, хвалюе, і гэта зразумела, як мы будзем забяспечаны хлебам. Агульны баланс па збожжу складваецца такі. Для забеспячэння насельніцтва хлебам, а жывёлагадоўлі фуражом нам трэба яго мець у межах 10 мільёнаў тон. Сабрана ў гэтым годзе 7,5 мільёна тон. Каб без асаблівага напружання забяспечваць нашы патрэбнасці, неабходна яшчэ 2,5 мільёна тон. Праблема гэта вырашаецца такім чынам. Ёсць цвёрдая дагаворанасць з Казахстанам, што ён паставіць нам 2 мільёны тон збожжа, і яно ўжо адгружаецца. Акрамя таго, з гэтай рэспублікі па асобнаму пагадненню будзе пастаўлена 500 тысяч тон збожжа з Кустанайскай вобласці.

Зразумела, галоўнай крыніцай забеспячэння людзей прадуктамі харчавання ў нас была і застаецца наша сельская гаспадарка. А тут сёння ідуць вельмі складаныя працэсы. Перапляліся паміж сабой і вельмі цяжкія эканамічныя ўмовы, якія выкліканы ростам цэн на набываемую тэхніку і іншыя матэрыяльныя рэсурсы, і настрой няўпэўненасці, няясна сці ў многіх з пераўтварэннем саміх сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, што будзе з калгасамі і саўгасамі.

Урад ведае, бачыць гэтыя праблемы і з разуменнем ставіцца да тых грамадскіх рухаў, якія, праўда, са сваіх пазіцый, але выказваюць інтарэсы аграрнікаў, праяўляюць клопаты аб селяніне, аб тым, як яму выйсці з той складанай сітуацыі, у якой апынулася наша сельская гаспадарка. Эканамічнае становішча большасці калгасаў і саўгасаў сапраўды вельмі цяжкае. І ўрад робіць усё, што ў яго сілах, каб падтрымаць іх. У гэтым годзе з бюджэту звыш таго, што намячалася першапачаткова, будзе выдзелена дадаткова 33,5 мільярда рублёў. Мы спрабуем знайсці агульную пазіцыю з Нацыянальным банкам, каб частку гэтай сумы выдаць у форме крэдытаў пад гарантыі дзяржавы. 200 мільёнаў рублёў ужо накіравана на падтрымку фермерскіх гаспадарак.

Усё гэта робіцца не толькі ў інтарэсах сельскагаспадарчага вытворцы, а ў інтарэсах усяго нашага насельніцтва. Тут пазіцыя ўрада адназначная: калі мы хочам палепшыць жыццё народа, калі мы хочам вылечыць сваю хворую эканоміку і забяспечыць незалежнасць нашай маладой дзяржавы, а гэта так, і па-іншаму быць не можа, то трэба ў першую чаргу ствараць неабходныя ўмовы для нармальнай, зацікаўленай работы ўсіх вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі.

Што датычыць форм гаспадарання, то ўсе яны маюць права на існаванне, і зрэшты справа саміх сялян, якой яны аддадуць перавагу. Але сёння нас у асноўным кормяць калгасы і саўгасы, і таму трэба не падрываць іх, а ўсяк падтрымліваць. Запуск механізмаў рынкавай эканомікі і яго важнейшага элемента—свабодная цэнаўтварэння зусім па-іншаму, чым гэта было раней, фарміруе ўсё сацыяльнае жыццё. Любыя вагаанні ў эканоміцы праз цэны рэзанансам адбіваюцца на жыцці людзей.

У прынцыпе тое, што без свабодных цэн рынку быць не можа, ясна, напэўна, кожнаму. Але і абрушыць адразу ўсю моц цэнавага націску на людзей таксама нельга. Таму Вярхоўны Савет і ўрад ужо тройчы павышалі ў гэтым годзе мінімальную заработную плату з адначасовым павелічэннем размеру пенсій, стыпендый, дапамог і іншых сацыяльных выплат. Акрамя таго, урад палічыў неабходным з ліпеня штомесячна выплачваць непрацуючым пенсіянерам дадаткова да пенсіі 300 рублёў. На ўсё гэта за 9 месяцаў толькі з бюджэту выдаткавана каля 40 мільярдаў рублёў. Усё, што маглі, усё, што дазваляў бюджэт, мы рабілі для таго, каб падтрымаць людзей, не дапусціць, каб большая частка насельніцтва аказалася за рысай беднасці. Але жыць многім, вядома ж, стала вельмі і вельмі цяжка.

Урад і далей будзе настойліва шукаць, што яшчэ можна зрабіць для людзей, аж да таго, каб у гэтых мэтах пайсці на далейшае павелічэнне бюджэтнага дэфіцыту, які, як я ўжо сёння дакладваў, і так не малы.

Чарговым крокам у гэтым напрамку з'яўляецца прыняцце ўчора Вярхоўным Саветам па прапанове ўрада рашэння аб павелічэнні мінімальнай заработнай платы да 2 тысяч рублёў у месяц.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

РЫХТУЕМСЯ ДА ЗІМЫ

Як зберагчы цяпло ў доме?

Ці задумваліся вы, куды ідзе цяпло з дома? Перш за ўсё праз балконныя дзверы, вокны і выцяжныя вентыляцыйныя адтуліны, якіх у любой кватэры дзве: на кухні і ў туалеце.

Што трэба зрабіць, каб праз балконныя дзверы не губляць цяпло?

Уцяпляльны шнурок, пракладзены па перыметру балконных дзвярэй, як правіла, пры рамонце зафарбоўваецца, а ён павінен быць чыстым, мяккім. Зафарбаваны, ён не дае ўшчыльнення, і цёплае паветра ідзе на вуліцу. Шнурок прамыць у ацэтоне ад фарбы, каб ён быў мяккім, ці замест шнурка прыклеіць вузкую палоску мікрапорыстай гумы шырынёй каля 1 см так, каб яна крыху выходзіла за край кромкі. Прыклеіць гуму можна клеем 88, «Момант». Гнёзды запораў, як правіла, дэфарміраваныя, яны не даюць нармальнага прыціскання дзвярэй. Трэба замяніць сапсаваныя планкі дзвярных запораў.

Балконныя дзверы двайныя, і паміж імі трэба пакласці тонкую палоску паралону, а калі яго няма, абмазаць дзірку вакол замазкай ці абклеіць паперай. З вуліцы трэба па перыметру дзвярнога праёма прыбіць планку з наклеенай мікрапорыстай гумай. Закрыўшы дзверы, прыбіць планку з гумай. Страты цяпла праз дзверы рэзка скароцяцца.

Гэтак жа трэба апрацаваць і акно, якое выходзіць на балкон. Секцыю акна, якое выходзіць на балкон (лоджыю), можна абклеіць з памяшкання яшчэ і паперай, як гэта звычайна робіцца. Меншую секцыю акна мы будзем адкрываць для праветрывання кватэры, таму яе заклейваць не трэба, але планкі з мікрапоркай з боку вуліцы лепш прыбіць і для маленькай секцыі. Паміж рамамі пакладзіце паралон ці абмажце шчыліну гэтай секцыі вакол замазкай або абклейце паперай. Калі няма магчымасці замяніць дэфармаваныя гнёзды запораў, трэба большую секцыю акна, якое выходзіць на балкон, прыціснуць да рамы дадатковай планкай з тоўстай фанеры ці дошкі так, каб маленькая секцыя акна магла свабодна адкрывацца для праветрывання.

Паглядзіце на чарцяжы, і вам стане зразумела, як гэта зрабіць.

Праз дзве вентыляцыйныя адтуліны, якія знаходзяцца на кухні і ў туалеце, таксама губляецца нямала цяпла. Раніцай вы ідзяце на работу, у кватэры нікога не застаецца, і вентыляцыя яе да вашага прыходу не патрэбна: у вентыляцыйныя адтуліны ўвесь дзень ідзе цяпло.

А калі з кватэры выйшла цёплае паветра, у ёй ствараецца разраджэнне, і халоднае паветра з вуліцы з вялікай сілай паступае праз адтуліны. Не патрэбна і кругласутачная вентыляцыя туалета, яна неабходна толькі ў час карыстання ім, гэта значыць, 10—15 хвілін. Таму гэтыя 2 вентыляцыйныя адтуліны трэба трымаць закрытымі і адкрываць толькі пры неабходнасці: пры гатаванні ежы, пры карыстанні туалетам. Эканомія цяпла будзе адчувальнай.

Трэба зрабіць з фанеркі, дошкі ці аргаліту шчыток па размеру вентыляцыйнай адтуліны, умацаваць на ім кручкі і вешаць на краты, якімі закрыта вентыляцыйная адтуліна.

Для вырабу кручкоў і іх устаноўкі на фанеры, кардоне трэба ўзяць тонкі цвік ці дрот (што ёсць пад рукой), у пласцінцы прабіць цвіком адтуліну, прапусціць дрот і адзін канец загнуць невялікім кручком. Гэтымі кручкамі мы і будзем вешаць пласцінку на краты, перакрываючы дарэмны выхад паветра з кватэры.

Можна падняць у пакоі тэмпературу градусы на 2—3. Для гэтага трэба паставіць вентылятар каля ацяплальнай батарэі так, каб паветра гналася ім на батарэю. У пакоі стане крыху цяплей.



ХАТНІЯ НАРЫХТОЎКІ

Буракі ў слоіках

Марынаваныя. Неачышчаныя буракі памыць, заліць халоднай вадой і зварыць да мяккасці. Потым ачысціць, нарэзаць саломкай ці кубікамі, пакласці ў слоікі і заліць астуджаным марынадам. Можна не закатваць, накрыць поліэтыленавымі накрыўкамі ці абвязаць шчыльнай паперай.

Для прыгатавання марынаду да 1 шклянкі воцату дадаць шклянку вады, 1 сталовую лыжку цукру, 0,5 чайнай лыжкі солі, крыху перцу, гваздзікі і лаўровага лісту. Усё гэта перамешваюць, даводзяць да кіпення і ахалоджваюць.

Можна перад тым, як заліць марынадам, перасланіць палосы наразаюцца брускамі, але не роўнымі, а коса — у выглядзе трапецыі, так яны лепш кладуцца ў слоікі. Кавалкі націраюць буйной соллю (пажадана не ёдавай), змяшанай з молатым перцам, здробненым лаўровым лістам ці кменам, каляндрай (хто як любіць), кладуць у слоікі слаямі, вузкімі канцамі да цэнтра. Калі ў сярэдзіне аказваецца пустата, яе можна запоўніць спецыяльна выразаным па форме кавалачкам. Верх слоіка запаўняецца больш дробнымі кавалкамі. Зверху да самай накрыўкі слоік засыпаецца соллю і закатваецца. Захоўваць можна ў звычайнай кладоўцы, толькі не на святле.

Калі слоік адкрываюць, сала лепш усё адразу выцягнуць, абчысціць соль нажом і, склаўшы ў цэлафанавы мяшок, змясціць у маразілку халадзільніка. Сала атрымліваецца вельмі смачнае, і нават праз год — нібы толькі што пасоленае.

Сала на ўвесь год

Свіное сала — прадукт устойлівы, калі яго ўмела пасаліць, захоўваецца дастаткова доўга. І ўсё ж смак старога сала прайграе ў параўнанні са свежым. Для аматараў сырога сала (што, дарэчы, вельмі карысна, як сведчыць сучасная медыцына, для людзей любога ўзросту) можам парэкамендаваць нескладаны рэцэпт захоўвання ўсіх якасцей свежага сала даволі працяглы час — да некалькіх гадоў.

Спатрэбяцца трохлітровыя слоікі і накрыўкі. Пасля забою свіное сала павінна добра астыць (дні два-тры). Пасля гэтага яго трэба нарэзаць палосамі шырынёй не больш за 10 см.

Мы павінны аб'яднаць намаганні ў імя галоўнага...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й і 2-й стар.).

У цэлым жа трэба адзначыць, што тэмпы росту заработнай платы ў народнай гаспадарцы даволі блізкія да індэкса рознічных цэн. За 9 месяцаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года яна навялічылася ў 8,2 раза, а індэкс цэн быў у межах 9,3 раза. Перавышае індэкс цэн рост зарплаты ў прамысловасці, будаўніцтве. Некалькі ніжэйшы ён у калгасах і саўгасах, аднак гэта без уліку даходаў ад асабістых гаспадарак.

Дарэчы, адна з самых нізкіх зарплат сёння — гэта зарплата работнікаў органаў дзяржкіравання. Да таго ж расце яна тэмпамі больш нізкімі, чым у іншых галінах. Гэта вельмі ўскладняе магчымасці камплектавання дзяржаўных і ўрадавых структур кваліфікаванымі кадрамі. Матэрыяльна сёння намнога лепш працаваць у іншых сферах, асабліва ў банках і камерцыйных структурах.

І наогул, павінен сказаць, што з крытыкай у адрас урада наконт таго, што органы кіравання ў нас разбухлі, я не магу згадзіцца. Тое, што якасць работы іх павінна паляпшацца, што яны павінны дзейнічаць намнога больш арганізавана, дакладна, эфектыўна, гэта бясспрэчна. Але ў той жа час нельга не лічыцца з тым, што мы будуем сваю незалежную дзяржаву. Паявілася многа тых функцый, якіх раней у нас не было, а для таго, каб гэтыя функцыі рэалізаваць, патрэбны адпаведныя кіраўніцкія структуры. І нельга спрошчана меркаваць аб тым, патрэбен ці не патрэбен той або іншы орган кіравання.

Тым не менш, мы працуем над тым, як спрасціць і скараціць апарат органаў дзяржаўнага кіравання. І ўрадам дадзены адпаведныя даручэнні, каб знайсці магчымасць ужо ў бліжэйшы час зменшыць яго колькасць у межах 10 працэнтаў. Хоць больш за ўсё кіраўніцкі апарат разбухае не ў дзяржаўных органах, а ў гаспадарчых структурах. І мы цяпер шукаем падыходы да таго, каб навесці тут парадак.

Калі вярнуцца да пытанняў зарплаты, то трэба адзначыць, што яны становяцца ўсё больш вострымі для работнікаў бюджэтных устаноў. І вастрыня гэта не ў тым, што яна вельмі бурна праяўляецца праз патрабаванні настаўнікаў, урачоў, работнікаў культуры і навукі. З пункту гледжання аб'ектыўнага погляду на гэтыя рэчы, усё тут правільна. У многіх сапраўды зарплата маленькая, і яе трэба павышаць. І мы разумеем тую занепакоенасць, якая праяўляецца з гэтай прычыны камісіяй Вярхоўнага Савета на чале з Нілам Сямёнавічам Гілевічам.

У сувязі з гэтым неабходна адзначыць наступнае. У рамках артыкула 34 Закона аб адукацыі з 1 верасня зарплата настаўнікам павялічана ў паўтара раза. Адначасова з гэтым павышана зарплата некаторым іншым катэгорыям работнікаў. Вядома, гэта не вычэрпвае ўсёй праблемы, і ўрад і далей будзе працаваць над тым, каб зарплату ў галінах, фінансуемых з бюджэту, павышаць і скараціць яе адставанне ад аплаты працы ў вытворчых галінах. Але тут трэба агаварыць два моманты.

Першы момант заключаецца ў тым, што на прыкладзе атрымаўшага шырокую вядомасць 34-га артыкула Закона аб адукацыі, дзе размова ідзе аб аплаце працы педагагічных работнікаў, трэба рабіць вывады аб тым, каб артыкулы прымаемых законаў фармуляваліся б гранічна дакладна, выключаючы ўсякую двухсэнсавасць у іх тлумачэнні. У прыватнасці, звяртае на сябе ўвагу тое, што гэты артыкул патрабуе, каб сярэдняя стаўка зарплаты педагагічных работнікаў устанаўлівалася на ўзроўні сярэдняй зарплаты служачых у прамысловасці. Я хацеў бы тут заўважыць, што сама па сабе сярэдняя стаўка настаўніку не ўстанаўліваецца. Зарплата яму вызначаецца зыходзячы з канкрэтных тарыфных ставак з улікам кваліфікацыі.

Другі немаважны момант заключаецца ў наступным. Сёння работнікі адукацыі, выстаўляючы патрабаванні аб штомесячным прывядзенні аплаты сваёй працы ў адпаведнасць з узроўнем аплаты працы служачых у прамысловасці, не ўлічваюць тую акалічнасць, што павелічэнне выплат работнікам бюджэтных устаноў можа адбыцца толькі пасля таго, калі ўзнікне крыніца для такіх выплат. А ва ўмовах зніжэння вытворчасці такія крыніцы ў патрэбным аб'ёме самі па сабе не ўтвараюцца. Да таго ж трэба яшчэ гэту крыніцу праз бюджэтны механізм забраць і накіраваць на патрэбныя мэты. Дзве гэтыя аперацыі па часе ніяк не супадаюць, тым больш, што і рэзерваў у бюджэце няма. Нам трэба быць гранічна ўважлівымі, больш удумлівымі ў выкарыстанні такога тонкага інструмента адносін дзяржавы з людзьмі, як аплата працы. Гэта датычыць усіх работнікаў, і вырашаць гэтыя пытанні трэба ў комплексе. Хіба ў нас вырашаны гэтыя пытанні ў адносінах да творчай інтэлігенцыі — пісьменнікаў, мастакоў, акцёраў? І наогул усяго, што сведзейнічае падтрымцы нацыянальнай культуры, яе адраджэнню, умацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы, звязанай з беларускай мовай і літаратурай? Мы разумеем, што тут мы ў даўгу, і будзем гэта становішча выпраўляць як у частцы падаткаў, так і аплаты працы.

Асаблівай падтрымкі і клопатаў патрабуюць ваеннаслужачыя. Бадай, гэта катэгорыя нашых людзей аказалася цяпер у найбольш складаным становішчы, і мы імкнёмся да таго, каб максімальна гэта становішча аблегчыць. Вядома, неабходна і яшчэ больш увагі ўдзяліць пенсіянерам, усім, хто па стану здароўя, узроўню даходаў і іншых аб'ектыўных прычынах не можа зарабіць сабе на жыццё. Таму да ўступлення з будучага года новага Закона аб пенсіях урад мае намер прадоўжыць дадатковыя штомесячныя грашовыя выплаты непрацуючым пенсіянерам, прычым у павялічаных размерах—да 500 рублёў. І па індэксіраванню ўкладаў маламаёмных грамадзян таксама будзем вырашаць, з тым каб яны ў меншай ступені зведвалі выдаткі інфляцыі.

Велізарны ўплыў на ўсю сацыяльную атмасферу робіць спажывецкі рынак, таксама як і сама сацыяльная абстаноўка дыктуе паводзіны гэтага рынку. Стан спажывецкага рынку ў цяперашніх умовах ацэньваецца цэлым радам новых прыкмет, уключаючы і такую найбольш важную, як звужэнне яго ёмістасці, але не ад пераносчанасці таварамі, а ад істотнага зніжэння плацёжных магчымасцей насельніцтва ў сувязі з высокім узроўнем цэн. Гэта адбіваецца ў першую чаргу на фізічных аб'ёмах рознічнага тавараабароту, які за 9 месяцаў знізіўся на 27 працэнтаў. Значная частка грошай пераключылася на самыя надзённыя патрэбы. На жаль, і гэтыя грошы не могуць забяспечыць захаванне дасягнутых раней узроўняў спажывання. Таму і павінна быць дзяржаўная падтрымка, каб любымі спосабамі забяспечыць усяму насельніцтву неабходны мінімум спажывання.

Вельмі турбуе людзей перспектыва застацца без работы. Падставы для гэтага, вядома, ёсць. У перыяд такіх вялікіх пераўтварэнняў у эканоміцы, якія цяпер ажыццяўляюцца, без гэтага, на жаль, не абысціся.

Пакуль беспрацоўе ў нас не набыло масавага характару. На пачатак кастрычніка ў цэнтрах занятасці зарэгістравана каля 15 тысяч беспрацоўных. Гэта 0,3 працэнта ад агульнай колькасці занятых у народнай гаспадарцы. Але ўрад гатовы да таго, што беспрацоўе можа ўзрасці, і прымае ўсе неабходныя меры для таго, каб змякчыць яго вынікі шляхам выплаты дапамог, перакваліфікацыі і іншых мер. У той жа час мы разглядаем права на рабочае месца як фундаментальнае права ўсіх грамадзян і ставім барацьбу з беспрацоўем на першы план сваіх эканамічных і сацыяльных прыярытэтаў.

Пры ўсёй цяжкасці матэрыяльнага становішча людзей, іх усё больш і больш хвалюе набіраючая сілу злачыннасць, калі чалавек не адчувае сябе ў бяспецы на вуліцы і дома, калі пад выглядам рынку яго ледзь ці не на кожным кроку спрабуюць абабраць спекулянты рознага калібру. І гэта яшчэ раз пацвярджае праведзенае нядаўна па ініцыятыве ўрада групай незалежных экспертаў сацыялагічнае даследаванне. На першым плане з таго, што хвалюе людзей, аказаўся іменна страх перад злачыннасцю.

Бачачы такую абстаноўку, урад узмацніў меры з тым, каб збіць хвалю нарастаючай злачыннасці, пакласці канец якім бы там ні было злоўжываННям службовым становішчам, карупцыі, якая, як ракавы нарост, стала раз'ядаць грамадства. Закрываць па гэта вочы проста нельга. І нас не спыніць, што прынятыя наконт гэтага меры некаторым не спадабаліся. Мы будзем нарошчваць свае намаганні супраць злачыннасці ў любым яе праяўленні, нягледзячы на чыны і званні.

Усякага роду дзялкі, якія спрабуюць абабраць народ, моцна будуць атрымліваць па руках і ў выніку яшчэ адной прынятай намі меры — аднаўлення дзяржаўнай манаполіі на гандаль алкагольнымі напіткамі, півам, тытунёвымі вырабамі. Забаронены продаж на біржах цэнтралізавана размяркоўваемых рэсурсаў. У жорсткія рамкі пастаўлены аматары накручваць цэны пры дапамозе шматразовых перапродажаў. Узмоцнена роля дзяржавы ў галіне экспарту. І мне здаецца, што народ такія дзеянні адабрае. Людзі маюць права бачыць у асобе дзяржавы свайго надзейнага абаронцу. І мы павінны дзейнічаць належным чынам. Але, мне здаецца, у апошні час узнікае пэўная заканамернасць. Як толькі ўрад пачынае рабіць любыя рашучыя крокі — няхай гэта будуць цэнавыя абмежаванні на прадукцыю прадпрыемстваў-манапалістаў, упарадкаванне продажу віннагарэлачных вырабаў або іншыя меры ў эканоміцы або ў барацьбе са злачыннасцю — як тут жа ў хор незадаволеных гэтымі дзеяннямі ўплятаюцца галасы любых палітыкаў, якія ўзялі за правіла крытыкаваць усё запар, мала клапоцячыся аб тым, да чаго гэта можа прывесці.

Так, у нас не ўсё атрымліваецца так, як бы гэтага хацелася. Ёсць пралікі, і немалыя. На жаль, гэта звязана і з тым, што не ўсе члены ўрадавай каманды працуюць як адзінае цэлае.

Ёсць ва ўрадавай камандзе і такія, хто спрабуе стварыць сабе на ўсякі выпадак зручную нішу на будучыню, падладжваюцца пад розных лабістаў і імкнуцца выгарадзіць сябе, ухіліцца ад адказнасці за становішча спраў на тых участках, за якія яны нясуць прамую адказнасць. Гэта перашкаджае рабоце, і я ім наконт гэтага выказаў свае прэтэнзіі. Больш таго, у мяне ўсё больш і больш вырысоўваецца план сур'ёзнай рэарганізацыі ўрада. І я ўжо сёння гатовы запрасіць на пасаду віцэ-прэм'ера прадстаўніка любых палітычных плыняў, які здольны ўнесці канструктыўны ўклад у работу ўрада і садзейнічаць устанаўленню грамадзянскай згоды ў нашым грамадстве.

Цяпер гэта без усякага перабольшання аснова ўсяго. Мы ні ў якім разе не павінны даць сябе ўцягнуць у бездань палітычных разладаў і нацыянальных канфліктаў, тым больш што ўсе мы з'яўляемся сведкамі сумных вынікаў гэтага ў іншых рэспубліках былога Саюза. Хіба нам таксама патрэбны грамадзянская вайна, кроў і пакуты?

Мы павінны даражыць той адносны стабільнасцю, якая ў нас сёння існуе і за якую нас паважаюць у свеце, і не дапусціць, каб яна была парушана. Хоць па ўсім адчуваецца, што гэтага сяму-таму вельмі хацелася б.

Мы павінны аб'яднаць свае намаганні ў імя галоўнага — у імя беларускага народа, станаўлення нашай дзяржавы.

НА СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Урад крытыкуюць моцна, але ці пераканаўча?

Учора раніцнае пасяджэнне сесіі пачалося з пункту «рознае». Але, па сутнасці, выступленні дэпутатаў, хоць і адрозніваліся па тэматыцы, усе ў той ці іншай ступені былі працягам абмеркавання інфармацыі В. Кебіча аб эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы. А яна няўхільна пагаршаецца, і сёння рэдкі парламентарый, калі ён не хоча страціць давер выбаршчыкаў, аднадумцаў па партыі, фракцыі, руху, упусціць магчымасць рэзка выказацца з гэтай нагоды.

Бунтуюць настаўнікі, пагражаюць забастоўкай, калі ім не павысяць зарплату. Што рабіць? Дэпутат А. Трусаў прапануе ўраду: увесці мараторый на верхнюю планку зарплаты ў дзяржаўных службах, каб у рэспубліцы ніхто з іх не атрымліваў больш Старшыні Вярхоўнага Савета і Саўміна, а таксама плату за карыстанне падручнікамі. Вось вам і грошы для настаўнікаў.

Дэпутат Р. Самусевіч пазнаёміла прысутных са эваротам афіцэрскага сходу гарнізона Асіповіч, у якім зноў жа пераважна эканамічныя прэтэнзіі і патрабаванні.

Дэпутат М. Бойка перадаў патрабаванні чарговага мітынгу кардынальна змяніць эканамічную палітыку, у прыватнасці, павышаць зарплату прапарцыянальна росту цэн.

Дэпутат В. Марозаў пазнаёміў з рашэннем сходу ветэранаў узброеных сіл: дабіваецца адстаўкі старшыні Дзяржкампрацы Бадзея.

Старшыня ВС двойчы заклікаў парламентарыяў не парушаць этычныя нормы, не абражаць прадстаўнікоў урада. І нават адключыў мікрафон у канцы выступлення П. Пракаповіча, які ўсе эканамічныя цяжкасці звёў да адной прычыны — неразумнага кіраўніцтва рэспублікай.

Але не памыляецца той, хто нічога не робіць. Да таго ж, уплыў адмоўных знешніх фактараў, напрыклад, сыравінная залежнасць ад Расіі, Украіны, неабавязковасць іх лідэраў, на што зрабіў акцэнт В. Кебіч у сваім выступленні, сапраўды. маюць месца. І як ні круціся, а пакуль што без нафты з Расіі, хлеба з Казахстана, цукру з Украіны не абыдзешся.

Аднак нават і тыя дэпутаты, што памяркоўна ацэньвалі яго дзейнасць (напрыклад, У. Гаркун: «Па многіх пазіцыях у сённяшняй вакханаліі ўрад працуе плённа»), усё ж крытыкавалі Саўмін за марудлівасць, нерашучасць, непаваротлівасць яго структур. Многія рабілі прэм'еру папрокі: маўляў, пра гэта нічога не пачулі, абышоў тую праблему, вось пра гэта чамусьці не сказаў і г. д. Быццам пра ўсё можна сказаць у абмежаваний часам інфармацыі. А каб і закрануў, то што змянілася б? На што істотна можа паўплываць жорсткая крытыка, якая прагучала ўчора ў адрас урада з вуснаў лідэра апазіцыі З. Пазьняка, які сваю галоўную крытычную стралу выпусціў у выглядзе паэтычнага радка з байкі Крылова: «А вы, сябры, як ні садзіцеся...».

У В. Кебіча як вопытнага адміністратара і палітыка заўсёды знойдзецца што адказаць нават на самае вострае слова, самую радыкальную прапанову. Бо сёння ніякая даўгачасная праграма, дакладна распрацаваная канцэпцыя не выратоўвае рэспубліку ад цяжкіх ударaў звонку. Сёння, на мой погляд, як ніколі, лёс эканомікі вырашае разумная тактыка, прыстасаванне, калі хочаце, да абставін, уменне манеўраваць у імя інтарэсаў Беларусі.

Кантроль за раённымі кадрамі, якія кінуліся будаваць палацы-асабнякі, не ў сілах наладзіць Саўмін, як гэтага патрабуе М. Дамашэвіч. І наўрад ці трэба В. Кебічу пазычаць паліва ў ваенных для патрэб вёскі, каб потым аддаць пасля асвоєння закінутых свідравін у Сібіры, як раіў А. Дубоўскі.

І зноў мы страцім час, калі абмеркаванне інфармацыі Старшыні Саўміна скончыцца размовамі. Змест некаторых выступленняў дэпутатаў наводзіць на думку, што так хутчэй за ўсё і будзе.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Аб парадку дня дзесятай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

57. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўным доўгу Рэспублікі Беларусь».
58. Аб праекце Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб балансе і размеркаванні прыбытку Нацыянальнага банка, зводным балансе банкаўскай сістэмы Рэспублікі Беларусь за 1991 год».
59. Аб праектах заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання.
60. Аб праекце Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб эканамічнай праграме ўрада Рэспублікі Беларусь на 1993 год і асноўных напрамках развіцця народнай гаспадаркі на перспектыву».
61. Аб праекце Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту Рэспублікі Беларусь за 1991 год».
62. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Дзяржаўным бюджэце Рэспублікі Беларусь на 1993 год».
63. Аб праекце Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб аднясенні на ўнутраны доўг Рэспублікі Беларусь часткі ўнутранага доўгу былога СССР, а таксама запазычанасці ўрада рэспублікі перад Беларускім акцыянерным камерцыйным аграпрамысловым банкам».
64. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах архітэктуры і горадабудаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь».
65. Аб праектах заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у дзеючыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь, якія выкліканы развіццём рыначных адносін.
66. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях» (другое чытанне).
67. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб парадку ўезду ў Рэспубліку Беларусь і выезду з Рэспублікі Беларусь».
68. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове навакольнага асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь» (другое чытанне).
69. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе».
70. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб выкарыстанні паветранай прасторы».
71. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прадпрыемствах у Рэспубліцы Беларусь».
72. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь» (другое чытанне).
73. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб імянных прыватызацыйных чэкавых кніжках у Рэспубліцы Беларусь» (другое чытанне).
74. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб акцыянерных таварыствах, таварыствах з абмежаванай адказнасцю і таварыствах з дадатковай адказнасцю» (другое чытанне).
75. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб процідзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі» (другое чытанне).
76. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пастаўках (работах і паслугах) для дзяржаўных патрэб».
77. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб свабодных эканамічных зонах у Рэспубліцы Беларусь».
78. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Мытным кодэксе Рэспублікі Беларусь».
79. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб мытным тарыфе Рэспублікі Беларусь».
80. Аб праекце Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб бязвыплатнай (з улікам жыллёвай квоты, сумы квот) перадачы ва ўласнасць жылля ахвярам палітычных рэпрэсій і іх сем'ям».
81. Аб праектах заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць пытанні рэабілітацыі і аднаўлення правоў грамадзян, пацярпеўшых ад рэпрэсій у 20—80-я гады.
82. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь» і ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах народных дэпутатаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь».
83. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб статусе народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь».
84. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў».
85. Аб праекце Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб гандлёвым абслугоўванні сельскага насельніцтва».
86. Аб праекце Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб прыватным, камерцыйным і кааператыўным гандлі ў Рэспубліцы Беларусь».
87. Аб адмене Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 1991 года «Аб часовым прыпыненні дзейнасці КПБ—КПСС на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь».
88. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь».
89. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб міліцыі».
90. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пажарнай бяспецы і дзяржаўным пажарным наглядзе».
91. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ускладненні на органы дзяржаўнай падатковай інспекцыі Рэспублікі Беларусь функцый дазнання».
92. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовых падатках і зборах у Рэспубліцы Беларусь».
93. Аб праекце Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб заключэнні першага намесніка Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь аб неабгрунтаванай адмове Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў у прызнанні паўнамоцтваў народнага дэпутата Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў Марыніча М. А.».
94. Аб праектах заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у дзеючыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з прапановамі органаў і асоб, якія валодаюць правам заканадаўчай ініцыятывы (арыенціровачны пералік праектаў прыкладаецца).
95. Кадравыя пытанні.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

20 кастрычніка 1992 г. г. Мінск.

ДАДАТАК ДА ПУНКТА 94

АРЫЕНЦІРОВАЧНЫ ПЕРАЛІК ПРАЕКТАЎ ЗАКАНАДАЎЧЫХ АКТАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ЗМЯНЕННЮ І ДАПАЎНЕННЮ ДЗЕЮЧЫХ ЗАКАНАДАЎЧЫХ АКТАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

1. Аб праектах заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь аб абароне спажывецкага рынку Рэспублікі Беларусь.
2. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб замежных інвестыцыях на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь».
3. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс аб шлюбе і сям'і Рэспублікі Беларусь».
4. Аб праектах заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь у сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прававым рэжыме тэрыторый, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджанню ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС».
5. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб парадку заключэння, выканання і дэнансацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь».
6. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прыярытэтным сацыяльна-культурным і эканамічным развіцці сяла і аграпрамысловага комплексу».
7. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь».
8. Аб праектах заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь аб прызнанні страціўшымі сілу некаторых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь у сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь «Аб статусе народнага дэпутата мясцовага Савета народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь».

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

АБ МІНІМАЛЬНАЙ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАЦЕ

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Зацвердзіць з 1 лістапада 1992 года мінімальную заработную плату ў размеры 2000 рублёў у месяц.
2. Адмяніць пункт 1 Пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 24 красавіка 1992 г. «Аб мінімальнай заработнай плаце».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

20 кастрычніка 1992 г. г. Мінск.

ХАТНІ АГАРОД

Вітлуф—белы ліст

Гэта салата вырошчваецца ў падвале ў поўнай цемры.

Белы качанчык вітлуфа не што іншае, як почка шматгадовай травяністай расліны — цыкорыю. Сінія кветкі цыкорыю, падобныя нечым на васількі, кожны можа бачыць паабапал дарогі, ля канавы ці каля рэчкі.

Цыкорый даўным-даўно разводзяць як агародніну дзеля яго карэнішча. У Еўропе корань цыкорыю яшчэ ў XVI стагоддзі выкарыстоўвалі як заменнік кавы. І ў нашы дні ён уваходзіць у састаў кафейных сумесей і вадкіх экстрактаў. Для гэтага створаны сарты цыкорыю з тоўстым карэнішчам.

Карані сушаць, размолваюць і злёгку падсмажваюць: цыкорый набывае прыемны пах і смак. Ён салодкі, таму што інсулін, які ўтрымліваецца ў корані, ператвараецца пры тэрмаапрацоўцы ў цукар.

А ў мінулым стагоддзі адзін садоўнік у Бельгіі, які вырошчваў цыкорнае карэнішча для кавы, пераканаўся, што ў цемры на корані вырастае вельмі смачнае лісце. І ён стаў першым, хто вырасціў салату з белымі лістамі зімой, калі не так ужо многа свежай агародніны, і не на градцы, а ў цёмным падвале.

Пышчотныя лісты вітлуфу з гарчынкай. Пікантную гарчынку надае асаблівае рэчыва — гліказід-інтыбін. Гэта лекавае рэчыва: яно некалькі павышае выдзяленне жоўці і тым самым паляпшае страваванне, дабратворна ўздзейнічае на печань, падстраўнікавую залозу, на крывятворныя органы і сардэчна-сасудзістую сістэму.

Спачатку сеюць дробнае насенне цыкорыю. Садзіць яго трэба не глыбей чым на адзін сантыметр, а калі глеба цяжкая, то і на паўсантыметра. Караняплоды растуць і набіраюць сілу да глыбокай восені. Ураджай збіраюць у канцы верасня ці нават у пачатку кастрычніка, але не пазней таго моманту, калі могуць наступіць моцныя замаразкі (мінус 5 градусаў). Выкапанае карэнішча пакідаюць у агародзе дзён на 7—8 для адтоку пажыўных рэчываў з лісця ў корань. Затым лісце зразаюць на 3 сантыметры вышэй сцеблявай галоўкі. Фокус зрэзкі ў тым, каб не пашкодзіць цэнтральную почку: з яе вырастае белы качанчык. Для пасадкі ў падвале ці ў цяплліцы адбіраюць карэнішчы таўшчынёй 3—5 сантыметраў, укарочваюць іх да 18—20 сантыметраў.

У хатніх умовах вітлуф можна вырасціць у скрыні вышынёй не менш 40 сантыметраў. На дно яе насыпце зямлю, торф ці піавінне слоем каля 15 сантыметраў. Садзіце караняплоды шчыльна адзін да аднаго і засыпайце зямлёй слоем у 2—3 сантыметры. Зямля павінна быць рыхлай, без камякоў, каб у час паліву яна добра ўбірала ваду. Паліваўце ўмерана па меры патрэбнасці і не ліце ваду адразу, а ў два-тры прыёмы: паліў — пачакаў, паліў — пачакаў. Скрыню пастаўце ў памяшканне з тэмпературай не вышэй 10 градусаў. Тыдні праз два, калі ў караняплода з'явяцца новыя карані, перанясіце скрыню ў больш цёплае месца (каля 18 градусаў). Поўная цемра абавязковая, інакш лісце пазелянее і будзе вельмі горкім.

Ураджай можна збіраць праз 3—4 тыдні. Лісты вітлуфу кволыя, збірайце іх асцярожна. Калі качанчыкі пакласці ў поліэтыленавы мяшок і трымаць пры нулявой тэмпературы, яны застаюцца свежымі тыдні са два.

СЯМЕЙНАЯ МАЙСТЭРНЯ

Утульны халат

Ён прамы, прасторны, з шырокімі рукавамі, зашпіляецца па ўсёй даўжыні зверху данізу, на вацінавай падкладцы; ніз, рукавы і каўнер аблямаваны. Зрабіць яго проста, а спатрэбіцца ён можа і ў халодным пакоі — у такім мяшку-халаце вы можаце сядзець перад тэлевізарам, вязаць або вышываць, не баючыся змерзнуць. Калі засцежку зрабіць яшчэ і па нізе, то такі халат цудоўна можа выканаць ролю спальнага мяшка ў турыстычных паездках.

Для вонкавага боку мяшка-халата трэба сабраць пабольш астаткаў розных тканін, каб падабраць спалучэнне хоць бы і яркае, але прыемнае для вачэй. Нам патрэбны 92 квадраты з бокам 22 см. Пасля таго як мы іх сшыем, бок будзе 20 см. Апрача таго, трэба 2,8 м ваціну або іншага ўцяпляльніку (пры шырыні 1,4 м), а таксама 4 м тонкай падкладачнай тканіны шырынёй 90 см. У якасці падкладкі можна выкарыстаць астаткі падкладачнай тканіны рознага колеру.

Для ніжняй часткі мяшка (200×120) патрэбна 60 квадратаў. Астатнія 32 складаюць прамавугольнік (160×80), з якога робім рукавы. Кожную з гэтых частак (ніжнюю і верхнюю—рукаўную) трэба прашыць з ваціннавай падкладкай, пасля чаго злучыць так, як гэта паказана на нашай схеме. Па гэтай жа выкрайцы зрабіць падкладку і прышыць яе. Пасля чаго выкраіць каўнер і аблямаваць яго, як і рукавы, ніз, полачкі, палоскай тканіны шырынёй 3 см. Засцежку можна зрабіць на гузіках або на пластмасавых кнопках. Вельмі зручна зрабіць засцежку на рукавах — адзін гузік або кнопка пасярэдзіне.



Як бачыце, мадэль гэтая настолькі простая, што выканаць яе можна нават чалавеку, які ніколі не браўся за шыццё.

Міксер не цацка, а сродак гатавання ежы...

Механізмы ў хатняй гаспадарцы значна спрашчаюць многія работы—мыццё бялізны, прасаванне, гатаванне ежы і г. д. Але купіўшы ўсякімі праўдамі і няпраўдамі дарагую тэхніку, зусім нямногія гаспадары і гаспадыні рэгулярна выкарыстоўваюць яе. Нярэдка гэтая тэхніка застаецца толькі прыгожай, прэстыжнай цацкай. Так часцяком атрымліваецца і з міксерамі, дапамога якіх у гатаванні ежы можа і павінна быць адчувальнай.

Прапануем некалькі рэцэптаў, дзе выкарыстанне міксера — адна з асноўных умоў, бо ўручную тут якаснай стравы не прыгатуеш. Дарэчы, і прадукты тут ідуць, у асноўным, тыя, якія ў продажы ўсё ж бываюць. За рэдкім выключэннем.



Яечны кефір

У шклянку кефіру дадайце 1 жаўток і 1 сталовую лыжку мёду. Перамешвайце на працягу 10—15 секунд.

Таматны кефір

У шклянку кефіру пакладзіце чайную лыжку таматнага соусу, соль, перац, цукар—па густу і ўсё перамяшайце. Замест соусу можна дадаць паўшклянкі таматнага соку.

Дамашні маянэз

Бярэцца паўшклянкі алею, сталовая лыжка воцату (але лепш лімоннага соку), чайная лыжка гарчыцы, 1 яйка, 40—50 грамаў мукі. Цукар, соль, перац дадаюцца па густу. Разбаўце муку ў чвэрці шклянкі вады і вазьміце столькі ж кіпеню. Разведзеную муку ўліце ў кіпень і астудзіце. У атрыманую сумесь дадайце ўсё астатняе і перамяшайце ў міксеры.

Маянэз зялёны

У дамашні маянэз дадайце 1—2 сталовыя лыжкі працёртай зеляніны — салаты, шпінату, пятрушкі або эстрагону і адну сталовую лыжку воцату (або лімоннага соку). Усё гэта старанна перамяшайце. Вядома ж, такі рэцэпт цяпер не зусім дарэчы, але ж зіма не вечная, прыйдзе і вясна!

Соус для салаты

Перамяшайце пяць сталовых лыжак алею, дзве сталовыя лыжкі воцату (або лімоннага соку), адну невялікую цыбуліну, соль, перац, крыху гарчыцы. Можна дадаць расцёртую дольку часнаку і крыху цукру.

Напітак з какавы з лёдам

Хоць гэты рэцэпт не для кожнай гаспадыні, але ўсё ж... Размяшайце тры-чатыры лыжкі парашку какавы і столькі ж цукровага пяску. Усыпце гэтую сумесь у 1,5—2 шклянкі малака, пакладзіце некалькі кавалачкаў лёду і перамяшайце ўсё г

ПРАГРАМА ТЭЛЕ-ПЕРАДАЧ

26 кастрычніка, ПАНЯДЗЕЛАК

Беларуская тэлебачанне

16.30. Пазакласнае чытанне. 3-ці клас.
16.50. «Сто першы». Мастацкі фільм. 1-я серыя.
18.00. Дак. фільмы «Вострaў у акіяне», «Агонія», «Кракадзіл пустыні».
19.00. Абласныя навіны (Брэст).
19.10. «Еўразія» прадстаўляе. Мультфільмы для дарослых.
19.45. Гаспадар. Хто займецца гароднінай?
20.15. «Пануль гарыць свечка». Паводле вершаў М. Цвятаевай.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Спартыўны тэлекур'ер.
21.45. Творчае аб'яднанне МЭТА. Тэлевізійны Дом кіно.
22.50. НІКа.
23.05—23.45. Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Беларусь — Латвія.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Каталажка». Мастацкі фільм.
9.30. «Размова на свежым паветры». Частка 3-я «Ю. Левітанскі».
10.30. «Руская песня». Дак. фільм.
11.00—11.20. Навіны (з сурдаперакладам).
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Тэлемікст.
15.10. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.00. Асацыяцыя дзіцячага тэлебачання. «Казачнае падарожжа містера Вільбо Бегінса-Хабіта».
17.00. Навіны.
17.25. НЗП.
17.55. Зорная гадзіна.
18.35. Футбольны агляд.
19.05. Кніжны двор.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Тэлесерыял «Дробязі жыцця». 5-я серыя «Версія».
21.10. Вамонд.
21.25. Аднак.
21.35. Сітуацыя.
22.05. Яўгеній і...
22.10. Мы...
22.15. Бім-бом
23.00. Навіны.
23.25—23.55. Мегамікс.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Зусім сакрэтна.
8.50. «НТС на фоне Крамля».
9.10. Наш сад.
9.40. Вуснамі дзіцяці.
10.10. Мульці-пульці. «Віміні».
10.30. Складчына.
11.00. «Два радкі дробным шрыфтам». Мастацкі фільм.
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. Абмеркаванне аўстрыйскага тэлефільма «Сям'я Смірновых. Як жыць далей?»
15.45. Адлюстраванне.
16.30. Там-там-навіны.
16.45. Давайце разбяромся.
17.00. Настальгічныя вячоркі.
17.45. «Прарок імперы і апостал чалавечнасці». Да 150-годдзя з дня нараджэння В. Верашчагіна.
18.30. Страсці па «эка-малу».
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. «Цень папараці». Мастацкі фільм.
20.50. Экран крымінальных паведамленняў.
21.00. Момант ісціны. На пытанні Андрэя Каравулава адказвае В. Ф. Шумейка.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Сёння ў ВС Расіі.
22.45. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.15. Свет спорту вачамі фірмы «Жылет».
23.45—0.15. «96 гадзін лета». Рэпартаж з Міжнароднага фестывалю эстраднай песні «Вільнюс-92».

27 кастрычніка, АЎТОРАК

Беларуская тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
9.00. Пазакласнае чытанне. 3-ці клас.
9.20. «Прэзумпцыя невіноватасці». Мастацкі фільм.
10.45. «Мусавір». Кінанарыс.
11.00—11.35. «Еўразія» прадстаўляе. Мультфільмы для дарослых.
16.30. Пазакласнае чытанне. 4-ы клас.
16.50. «Сто першы». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
18.00. Дак. фільмы «Сібірскія адрасы яе песень», «Калыханка з лялькай».
19.00. Абласныя навіны (Віцебск).
19.10. Эканамічная хваля. Развіццё сучасных сродкаў сувязі. Прымае ўдзел міністр сувязі і інфарматыкі Беларусі Г. М. Грыцук. Прамая лінія.
20.15. «Будучыня на вашым стале». Прэзентацыя камп'ютэра новага пакалення беларуска - амерыканскага сумеснага прадпрыемства «Самміт сістэмс».
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.35. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа; Футбол. Зборная Беларусі — зборная Украіны.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.05. У свеце жывёл (з сурдаперакладам).
9.55. «Страчаная галактыка». Мультфільм.
10.00. Футбольны агляд.
10.30. «Дробязі жыцця». Тэлесерыял. 5-я серыя «Версія».
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Дванаццаць крэслаў». Мастацкі фільм. 1-я серыя.
12.25. «Прэм'ера». Мастацкі фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Дзелавы веснік.
14.40. Свет грошай Адама Сміта.
15.15. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.05. Наш музычны клуб.
16.50. Тэхнадром.
17.00. Навіны.
17.25. «Як стары карову прадаваў». Мультфільм.
17.30. Міждзяржаўны тэлеканал «Астанкіна» прадстаўляе.
18.00. «Багатыя таксама плачуць».
18.45. Мініяцюра.
19.00. Тэма.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Усходняя хітрука». Мастацкі фільм.
22.00. Ваеннае рэвю.
22.30. Тэлемемуары.
23.00. Навіны.
23.25. «Каханне з першага погляду». Дзень 1-ы.
24.00—1.10. «Дванаццаць крэслаў». Мастацкі фільм. 1-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Момант ісціны.
8.50. Вольны час.
9.05. Настальгічныя вячоркі.
9.30. Белая варона.
10.15. «96 гадзін лета». Рэпартаж з міжнароднага фестывалю эстраднай песні «Вільнюс-92».
10.45. Страсці па «эка-малу».
11.00. «Дама з сабачкам». Мастацкі фільм.
12.25. Мульці-пульці «Станаўленне».
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. Мульці-пульці. «А+В».
15.40. «Бадабокі». Праграма для дашкольнікаў (Францыя).
16.00. Там-там-навіны.
16.15. Еўропа—Азія.
17.00. Магікане. Аркадзь Райкін.
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Аз есм.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. «Санта-Барбара».
20.10. Кабарэ «Вязглуздзіца».
21.00. Дзелавое кола. «Што перашкаджае рэформам».
21.50. Экспацэнтр прадстаўляе.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Сёння ў ВС Расіі.
22.45. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.15—0.30. Тэлеканал «Фартуна». Парад «зорак». Перадача 2-я.

28 кастрычніка, СЕРАДА

Беларуская тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Раз, два, тры». Кінанарыс.
9.00. Пазакласнае чытанне. 4-ы клас.
9.20. «Гамункулус». Мастацкі фільм з субцітрамі.
10.50—11.55. Міжнародны фестываль фальклору «Жыцень». Частка 1-я.
16.30. «Доктар Айбаліт». Мультфільмы 1-ы і 2-і.
16.50. Дзіцячая тэлефілармонія. «Бенжамін Брытэн у Вілейцы».
17.20. Футбол. Таварыскі матч. Зборная Беларусі — зборная Украіны.
19.20. Абласныя навіны (Гомель).
19.30. «Вобраз». Літаратурны часопіс.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа; «Агледзіны». Кароткаметражны фільм; Футбол. Зборная Беларусі — зборная Украіны. Чвэрць гадзіны пасля матча.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.50. Наш музычны клуб.
10.30. «Паломнікі». Дак. фільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Дванаццаць крэслаў». Мастацкі фільм. 2-я серыя.
12.25. «Ганна Ліса». Мастацкі фільм (Фінляндыя).
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлемікст.
15.15. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.05. «Надзея». Дабрачынны канцэрт для дзяцей-сірот.
17.00. Навіны.
17.25. Вечар тэлебачання Турцыі.
18.00. Г. Свірыдаў. «Маленькі трыпціх».
18.10. «Багатыя таксама плачуць».
18.55. Футбол. Адборачны матч чэмпіянату свету. Зборная Расіі — зборная Люксембурга.
19.50. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Рэпартаж ні аб чым.
20.50. Вечар тэлебачання Турцыі. Мастацкі фільм. «Раскіданая пасцель».
22.20. Ведзі.
23.00. Навіны.
23.25. «Каханне з першага погляду». Дзень 2-гі.
24.00—1.10. «Дванаццаць крэслаў». Мастацкі фільм. 2-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Дзелавое кола.
8.50. Залатая шпора.
9.20. Мульці-пульці. «Як вожык і медведзяня мянялі неба».
9.30. Тэлеканал «Фартуна». Парад «зорак».
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. Гармонія зямлі і вады.
12.05. Мегаполіс.
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Бізнес: новыя імёны.
15.15. «Тэрмінал». Рэпартаж з міжнароднай канферэнцыі па камп'ютарнай графіцы.
15.45. Далёкі Усход.
16.30. Там-там-навіны.
16.45. Хрысціянская праграма. «Брус Стэйсі і яго «каралеўства».
17.15. Паралельныя светы.
18.00. Апазіцыя.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. Сам сабе рэжысёр.
19.50. «Санта-Барбара».
20.40. «Новыя веды аб канцы свету». Дак. фільм.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Сёння ў ВС Расіі.
22.45. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.15. Крымінальныя паведамленні.
23.25—0.25. Цішыня № 9.

29 кастрычніка, ЧАЦВЕР

Беларуская тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Пейзаж з мэбляй». Мастацкі фільм (Чэха-Славакія).
10.15. Міжнародны фестываль фальклору «Жыцень». Частка 2-я.
11.20—12.20. Футбол. Зборная Беларусі — зборная Украіны. Чвэрць гадзіны пасля матча.
16.30. Прыродазнаўства. 3-ці клас.
16.50. «Доктар Айбаліт». Мультфільмы 3—7-ы.
17.45. Для школьнікаў. Скарбы беларускай гісторыі.
18.00. «Шлях на Евіна». Дак. фільм.
18.20. Якія мы гаспадары? Мінскі аўтазавод.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. Як пачаць уласную справу. Дыялог амерыканскіх бізнесменаў.
19.45. З музыкай на «Вы». Другое дыханне шадэўра.
20.15. Тыдзень беларускага ўрада.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Справа выпадку. Латарэя ўдачы.
21.30. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — студыя «Сэнс» у Маляўрыцкім раёне; НІКа.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.50. Футбол. Міжнародная сустрэча. Зборная Беларусі — зборная Украіны.
10.40. «Знакамітае качаня Цім». Мультфільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Дванаццаць крэслаў». Мастацкі фільм. 3-я серыя.
12.40. «Кабарэ майго жыцця». Мастацкі фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлемікст.
15.15. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.05. Спявае Т. Мацвеева.
16.20. ...Да 16 і старэйшым.
17.00. Навіны.
17.25. «Вагон 03».
18.00. «Багатыя таксама плачуць».
18.45. «Вялікая прагулка».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Лато «Мільён».
21.10. Дак. фільм «Наменклатура».
22.30. Музыка ў эфіры.
23.00. Навіны.
23.30. «Музыка ў эфіры». 2-я частка.
0.55—2.15. «Дванаццаць крэслаў». Мастацкі фільм. 3-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Камера даследуе мінулае. «Новыя веды аб канцы свету».
9.10. Вольны час. «Увага: здымаю!»
9.25. Сам сабе рэжысёр.
9.55. «Караван».
10.25. Непазнаны Сусвет.
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. Пілігрым.
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. Студыя «Рост». «Гуфі. геймз». Частка 1-я.
16.00. Там-там-навіны.
16.15. Урал-ТВ.
17.00. Так і жывём.
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. «Любімаўка-92». Фестываль маладой драматургіі.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. «Санта-Барбара».
20.10. У свеце аўта. і мотаспорту.
20.40. Спецыяльны камерцыйны веснік.
20.50. Мультфільм для дарослых «Мары, мары».
21.00. Айчына мая. «Пецярбургскія куткі».
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Сёння ў ВС Расіі.
22.45. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.15—0.45. «Новы ілюзіён».

30 кастрычніка, ПЯТНІЦА

Беларуская тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Кунгурскі феномен».
9.00. Прыродазнаўства. 3-ці клас.
9.20. «Печкі-лавачкі». Мастацкі фільм.
11.00. Міжнародны фестываль фальклору «Жыцень». Частка 3-я.
12.05—12.55. «126 слоў». Дак. фільм.
16.30. «Краканот». «Цудоўныя лекі». «Цяжка павуцінка». «Кубік». Мультфільмы.
17.10. Арыенцір. Перадача з Брэста.
18.00. «Прыроды храм нерукатворны». Дак. фільм.
18.30. Сістэма «Ньюс».
18.50. Абласныя навіны (Магілёў).
19.00. «Ад роднае зямлі...» Урачыстае пасяджэнне, прысвечанае 110-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.35. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа; Канцэрт, прысвечаны 110-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.
22.05. Палітбюро.
22.35. Музагляд. У перапынку (23.00) — Навіны.
23.40. Аўта-шоў.
23.55. Хіт-канвеер.
0.55—2.15. «Дванаццаць крэслаў». Мастацкі фільм. 4-я серыя.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.05. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
9.55. ...Да 16 і старэйшым.
10.35. «Дзеючыя асобы». Дак. фільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Дванаццаць крэслаў». Мастацкі фільм. 4-я серыя.
12.40. «Прыцемкам». Мастацкі фільм (Балгарыя).
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Брыдж.
14.50. Бізнес-клас.
15.10. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.00. Цэнтр.
16.40. «Верабейка - хвалько». Мультфільм.
16.50. Тэхнадром.
17.00. Навіны.
17.25. Кінаальманах «Зоркі Расіі».
17.45. Вагон 03.
18.15. Чалавек і закон.
18.50. Поле цудаў.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Мастацкі фільм «Асабістая зброя».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Рэклама.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. «Ракетны крызіс». 2-я частка.
8.50. Вольны час. «Птушкі побач з намі».
9.05. Джэнтльмен-шоў.
9.35. Айчына мая. «Пецярбургскія куткі».
10.30. «Падарожжа душы». Пісьменнік Георгій Сямёнаў.
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. Настальгічныя вячоркі.
12.20. Мульці-пульці. «Неспадзяваная сустрэча».
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. Студыя «Рост». «Гуфі. геймз». Частка 2-я.
16.00. Там-там-навіны.
16.15. Мінарэт.
16.30. Іжыца.
17.00. М-трэст.
17.15. Кіпрас Мажэйка. Рэпартажы з НАТО.
17.45. «Містэр Вугедзі». Мастацкі фільм.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. «Іванаў катэр». Мастацкі фільм.
21.00. «Віўен Лі — ладзі эпохі».
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Сёння ў ВС Расіі.
22.45. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.15—0.45. Вячэрні салон.

31 кастрычніка, СУБОТА

Беларуская тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Бацькі і дзеці». Мастацкі фільм. 3-я серыя.
10.00. Гарадніца. Літаратурна-мастацкая праграма.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Гамбіт. Шахматны клуб.
11.45. Л. Разумоўская. «Начныя карлікі і Антыгона». Спектакль тэатра імя М. Горкага.
13.55. «Калі вельмі захацець». Мультфільм.
14.05. Спорт і мастацтва. Рэспубліканскі фестываль у лагеры «Зубраня».
14.55. «На камні, жалезе і золаце». Літаратурна-музычная вечарына, прысвечаная творчасці М. Танка.
15.50. «Дзякуй вам, людзі!» Часопіс «Надзея» і надзеі інвалідаў.
16.20. «Банжур, Правансі» Музычная праграма з удзелам фальклорных калектываў Беларусі і Францыі.
16.55. Футбол. «Дынамо» (Мінск) — «Ведрыч» (Рэчыца).
18.50. ПІК.
19.35. Наш госць — народны дэпутат Рэспублікі Беларусь старшыня Маладзечанскага гарадскога выканаўчага камітэта Г. Д. Карпенка. Прамая лінія.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. «Сінема» прадстаўляе: мастацкі фільм «Парыжскія тайны» (Францыя — Італія).
23.20. Футбол-92. Вынікі тура.
23.35. НІКа.
23.50—0.25. «Пікнік па-сопацку». На музычных фестывалях у Сопаце.

Канал «Астанкіна»

6.00. Навіны.
6.20. Ранішняя гімнастыка.
6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. У свеце матораў.
8.00. «Марафон-15» — малышам. Мультфільм «Бамсі» (Швецыя).
8.25. Эльдарада.
8.55. Мультфільм «Чароўныя акуляры».
9.05. Па той бок рампы з усмешкай. А. Фацюшын.
9.20. Інстытут чалавека.
9.50. Стыль.
10.20. Экалагічная хроніка.
10.35. Справа.
10.45. «Дзяўчына без адраса». Мастацкі фільм.
12.20. Музычны кіёск.
13.00. «Нязгдзейсненая мара Мікалая Казакова» (Францыя). Фільм 2-гі.
14.00. Навіны.
14.25. Мастацкі фільм «Арабэла — дачка пірата».
15.55. Чырвоны квадрат.
16.45. «Вук». Мультфільм. 1-я серыя (Венгрыя).
17.15. «Гаты свет мой». Да 90-годдзя з дня нараджэння народнага артыста Міхаіла Яншына.
18.05. Мастацкі фільм «Вораг народа — Бухарын».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. КВЗ-92. Другая паўфінальная гульня сезона. Кунсткамера.
22.35—23.55. Еўропа плюс. У перапынку (23.00) — Навіны.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Тэма з варыяцыямі. Музыка Петрапалітана.
7.50. «Ручная работа». Пра новы метад лячэння язвы страўніка.
8.15. Азы кар'еры.
8.30. Калі вам за...
9.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
10.15. Вумеранг.
11.00. «Марыя, Мірабэла ў Транзісторыі». Мастацкі фільм.
12.10. Казырная дама.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. «Amiga veritas». Тэлеконкурс юрыстаў. Паўфінал.
14.50. Пілігрым.
15.30. «Дарэаман» (Японія). 8-я серыя.
16.05. Футбол без мяжы.
17.00. «К-2» прадстаўляе: «Абзац».
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Вуснамі дзіцяці.
18.15. Маскі-шоў.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. «Учора». Мастацкі фільм (Польшча).
20.50. Мультфільм для дарослых «Пінг-понг».
21.00. Кантрасты.
21.40. Рэпарцёр.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Асарці. Музычна-забаўляльнае шоў.
23.00. Праграма «А».
23.30. Ад лібітум.
24.00—1.30. «Унікум». Мастацкі фільм.

1 лістапада, НЯДЗЕЛЯ

Беларуская тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Бацькі і дзеці». Мастацкі фільм. 4-я серыя.
9.55. Заключны канцэрт фестывалю мастацтваў Мінскага інстытута культуры.
10.55. Урокі здароўя. Фізкультура ў барацьбе з астэхандрозам.
11.15. «Сіняй даўніны покліч. Помнікі расказваюць». «Вехі вякоў». Прадстаўляюць тележурналісты Узбекістана.
11.35. «Суперкніга». 23-я серыя.
12.10. «Мы гэта можам». Дабрачынны канцэрт дзяцячу мастацтва Беларусі для дзяцей-інвалідаў.
13.35. Час пісьма.
14.05. Восьмы колер вясёлкі. Фестываль дзіцячай творчасці ў Полацку.
14.35. Кіназкран-92. Лістапад.
15.50. «Вяселле старэйшага брата». Мастацкі фільм.
17.00. Футбол. «Беларусь» (Мінск) — «Тарпеда» (Мінск).
17.50. «Асляня». Мультфільм.
18.00. Брама. Міжнародны турызм.
18.45. «Запрашаем на вячоркі». Абрад «Вяселле трэцяга дня». Кіраўскі раён.
20.00. Панарама.
20.25. «Адказасобнік». Дак. фільм.
20.40. Калыханка.
21.00. «Каскад».
21.10. Студыя «Талесябрына». «Пепсі-топ-20».
21.50. «Сінема» прадстаўляе: мастацкі фільм «Апошняе вядомае месца жыхарства» (Францыя — Італія).
23.35—0.35. «Каралеўскае паляванне».

Канал «Астанкіна»

6.00. Гадзіна сілы духу.
7.00. Тыраж «Спортлата».
7.15. «Малышок і чорная маска». Мультфільм.
7.40. Выступленне турэцкага ансамбля «Адыген».
8.00. Мультфільм «Дэнвер — апошні з дыназаўраў». 8-я серыя (Францыя).
8.30. «Яла» запрашае ў чайхану.
10.00. Былое.
10.40. «Прыгоды Чорнага Прыгажуна». Мастацкі фільм. 16-я серыя «Пагоня».
11.05. Новае пакаленне выбірае...
11.55. «Цудоўныя імгненні танца». Б. Карыева.
12.50. Сола.
13.20. «Дом на Валхонцы». Фільм 3-ці.
13.50. Кожны пра сваё.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. «Трэцяя сусветная вайна. Адлік секунд».
15.20. Клуб падарожнікаў.
16.10. Панарама.
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.05. Тэлелоцыя.
18.20. Э. Олбі. «Хто баіцца Вірджыніі Вульф?» Фільм-спектакль тэатра «Сучаснік».
21.00. Вынікі.
21.45. Спартыўны ўік-энд.
22.00. «Вакзал мары». Юрый Башмет.
23.00. Навіны.
23.25—24.00. Пад крылом «Залатога арла».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Дакументальная панарама. «Лёс Кузьмы Паклонава».
8.25. Вольны час.
8.40. Фальклор.
9.10. Шэсць сотак.
9.30. «Прыгоды ў каралеўстве» Мультфільм. 10-я серыя.
10.00. Аты-баты...
10.30. Хочаце, верце...
11.00. «Дрэнны добры чалавек». Мастацкі фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. Тэлегульня «Лога».
13.50. Нядзеля ў правінцыі. «Алупка».
14.35. «Не высечы...» Вядучы — У. Цветаў.
14.50. «К-2» прадстаўляе: «Зоркі Амерыкі».
15.20. Поднер і Донах'ю.
15.50. У свеце жывёл.
16.50. «Дзякуй, ГІЦІС». Дабрачынны вечар у фонд Расійскай акадэміі тэатральнага мастацтва «ГІЦІС».
18.15. Клуб «Жоўтая падводная лодка».
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. Класічныя фільмы Галівуда. «Кроў на сонцы».
21.05. Тэлебюро расследаванняў. «Карупцыя».
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
23.20. «Я люблю РТБ». «Тэлегід».
24.00—0.30. Лясы.

ЗАПРАГРАМУЙЦЕ СВАЁ ЗАЎТРА...

Dainova Co Ltd

ТЭЛЕБАЧАННЕ

23 кастрычніка

Беларуская тэлебачанне

16.30. «Заечае серца». Маст. фільм з субцітрамі.
17.45. Мультфільм «Уся справа ў капелюшы».
18.00. Дак. фільм.
18.40. Сістэма «Ньюс».
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Творчая група праграмы «Тры кіты» ў Капыльскім раёне.
20.00. Студыя «Тэлесябрына».
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.35. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Канал «Астанкіна»

12.35. «Вярэшня Візбара». Маст. фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Брыдж.
14.50. Бізнес-клас.
15.10. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.00. Іграе А. Барахоўскі
16.10. Цэнтр.
16.50. «Тэхнадром».
17.00. Навіны.
17.25. Кожны аб сваім.
17.45. Чалавек і закон.
18.15. Поле цудаў. Юбілейны выпуск.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Маст. фільм. «Выкраданне прэзідэнта» (ЗША).
22.25. «ВіД» прадстаўляе. Палітбюро.
23.00. Навіны.
23.20. Музагляд.
0.00. Аўташоў.
0.15. Праграма «Х».
0.45. Эм-ці-Ві.

Канал «Расія»

12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. «Хіт-дзённік».
16.00. Там-там навіны.
16.15. Мегаполіс.
16.45. М-трэст.
17.00. Праз 90 гадоў.
17.45. Уолт Дысней па пятніцах. «Біг Фут».
18.35. Мульці-пульці.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. «Дынара». Маст. фільм.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. На сесіі ВС Расіі.
23.00. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.30. «К-2» прадстаўляе: «Ню».

24 кастрычніка

Беларуская тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Бацькі і дзеці». Маст. фільм. 1-я серыя.
10.00. «Пяшчота». Кінанарыс.
10.15. Вярэсце. Мастацка-публіцыстычная праграма.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Біблія і шляхі да яе: адвентысты Сёмага дня.
11.40. «Алімпіяда». Тэлеспектакль па раману І. Пташнікава.
14.10. Нафтабаза і яе праблемы.
14.35. Паміж намі, жанчынамі. Пра сутнасць нашага жыцця.
15.20. Здароўе — дзецям. Гарадок адпачынку ў пасёлку Ракаў.
16.05. Урокі І.-С. Баха. Музычная навела.
16.50. «Светлая асоба». Маст. фільм.
18.10. Ронда. Маналог скульптара Анатоля Арцімовіча.
18.30. Футбол. КІМ (Віцебск) — «Днепр» (Магілёў), «Хімік» (Гродна) — «Дынамо» (Брэст). Вынікі тура.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. «Сінема» прадстаўляе: маст. фільм «Прыгажуня з «Альгамбры» (Куба).
23.30. НІКа.

Канал «Астанкіна»

6.00. Навіны.
6.20. Ранішняя гімнастыка.
6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. Спорт-шанц.
8.00. «Марафон-15» —малышам.
8.25. НЛА: неаб'яўлены візіт.
8.55. Па той бок рампы з усмешкай.
9.25. Медыцына для цябе.
10.05. Авіякасмічны салон.
10.20. «Служэнне муз не церпіць мітусні». Вядучы С. Ямшчыкоў.
10.50. «Цэнтральны экспрэс». Тэлечасопіс аб Цэнтральнай і Усходняй Еўропе.
11.50. Палітра. Калекцыянеры.
12.20. «ВіД» прадстаўляе: «Справа».
12.30. Кароткаметражны фільм «Святло і цені».
12.50. «Мой сябар Мартын». Мультфільм.
13.00. «Нязгдзейсненая мара Мікалая Казакова» (Францыя). Фільм 1-ы.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. У свеце жывёл.
15.15. Іграе камерны аркестр «Віртуозы Масквы».
15.40. «Яноты». Мультфільм (Канада).
16.05. Чырвоны квадрат.
16.45. Хакей. «Спартак» — «Дынамо» (Масква).
18.35. Маст. фільм «Каталажка».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. КВЗ-92. Першая паўфінальная сустрэча.
22.40. «Пасля таго, як...» Мультфільмы для дарослых.
23.00. Навіны.
23.20. Сна-бачанне.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. «Эх, Расія, ты, Расія». Акт 2-гі «Мастак і ўлада».
8.15. Мульці-пульці. «Вада».
8.25. Праграма «03».
8.55. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
10.10. «Як жыць будзем?»
10.55. «В. В. Верашчагін — мастак, падарожнік, філосаф» (да 150-годдзя з дня нараджэння»).
12.05. Жорж Брасенс.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. Зігзаг удачы.
14.20. Пілігрым.
15.05. «Бурда модэн» прапануе...
15.35. Непазнаны Сусвет.
16.05. Футбол без граніц.
17.00. Залатая шпора.
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Вуснамі дзіцяці.
18.15. Джэнтльмен-шоў.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. «Таварышу Райкіну — акцёру і чалавеку».
20.30. Складні.
21.00. Зусім сакрэтна.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Асарці.
23.00. Праграма «А».
23.30. Ад лібітум.
0.00. «Два радні дробным шрыфтам». Маст. фільм.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь,
калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін — 32-60-13, давекі на рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.998. Індэкс 63.850.
Зак. № 214.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Не толькі ў пірагі

Як правіла, пітная сода кладзецца ў кулінарныя вырабы, выкарыстоўваецца ў некаторых іншых стравах. Але кожная гаспадыня павінна ведаць, што гэта ў многім першы яе памочнік.

Каб малако не першай свежасці пры кіпячэнні не згарнулася, дабаўце ў яго крыху соды (чвэ